Т.У. Апіок

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАНФЕСІІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілеў 2010

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя А.А. КУЛЯШОВА"

Т.У. Апіок

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАНФЕСІІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Вучэбна-метадычныя матэрыялы
для студэнтаў IV курса гістарычнага факультэта
(спецыяльнасць «Гісторыя айчынная і ўсеагульная»)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў 2010

УДК 28(091)(476)
ББК 86.37
А76

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета УА «МДУ імя А.А.Куляшова»*

Рэцэнзент

дацэнт кафедры гісторыі і культуры Беларусі
УА «МДУ імя А.А. Куляшова»

*С.А. Парашкоў*

**Апіок, Т.У.**

А76 Хрысціянскія канфесіі на беларускіх землях у складзе Расійскай імперыі: вучэб.-метад. мат-лы для студ. IV курса гістарычнага факультэта (спецыяльнасць «Гісторыя айчынная і ўсеагульная») / Т.У. Апіок. – Магілёў: УА «МДУ імя А.А. Куляшова», 2010. – 52 с.

У вучэбна-метадычных матэрыялах, якія прапануюцца студэнтам IV курса гістарычнага факультэта (спецыяльнасць "Гісторыя айчынная і ўсеагульная"), па тэме "Хрысціянскія канфесіі на беларускіх землях у складзе Расійскай імперыі" ў адпаведнасці з базавай праграмай курса аналізуецца канфесійная палітыка расійскіх улад і змены ў становішчы хрысціянскіх канфесій на тэрыторыі Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Вучэбна-метадычныя матэрыялы прызначаны аблегчыць падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў і ў працэсе самастойнай работы.

**УДК 28(091)(476)**
**ББК 86.37**

© Апіок Т.У., 2010
© Афармленне.
УА «МДУ імя А.А. Куляшова», 2010

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# УВОДЗІНЫ

Ва ўсіх дзяржавах, якія ўзніклі на постсавецкай прасторы, у тым ліку на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, відавочна ўзмацненне ўплыву царквы, рэлігійных норм і каштоўнасцей у жыцці грамадства. Царква ўключана ў грамадскае жыццё і разам з іншымі інстытутамі імкнецца аказаць пазітыўны ўплыў на адраджэнне культурнай традыцыі, духоўнае выхаванне, маральны стан грамадства. У канфесійнай гісторыі Беларусі на працягу некалькіх стагоддзяў пераважала хрысціянская рэлігійная традыцыя.

Дысцыпліна спецыялізацыі "Гісторыя хрысціянскіх канфесій на Беларусі" вывучаецца студэнтамі навуковай спецыяльнасці "Гісторыя айчынная і ўсеагульная" ў 7-м семестры. Праграма курса разлічана на 90 гадзін, у тым ліку аўдыторных – 58 гадзін, з іх лекцый – 42 гадзіны, семінарскіх заняткаў – 16 гадзін.

Праграма курса "Гісторыя хрысціянскіх канфесій на Беларусі" разлічана на азнаямленне студэнтаў з гісторыяй узнікнення, развіцця і распаўсюджання хрысціянства, традыцыямі і некаторымі агульнатэарэтычнымі пытаннямі. Курс прызначаны сфарміраваць у студэнтаў завершанае ўяўленне аб сутнасці і асаблівасцях узнікнення і развіцця хрысціянскіх канфесій на Беларусі.

Мэта курса – вывучэнне рэлігійных традыцый у хрысціянстве ўвогуле і ў дачыненні да канфесійнай гісторыі Беларусі ў кантэксце асноўных тэндэнцый яе палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця ў прыватнасці. Сярод важнейшых задач вывучэння дысцыпліны – вызначэнне зместу дзейнасці хрысціянскіх канфесій на розных этапах развіцця і характарыстыка статуса хрысціянскіх канфесій у іх узаемадзеянні з дзяржавай і грамадствам.

У вучэбна-метадычных матэрыялах, якія прапануюцца студэнтам па тэме "Хрысціянскія канфесіі на беларускіх землях у складзе Расійскай імперыі", у адпаведнасці з базавай праграмай курса аналізуюцца:

1. Канфесійная палітыка расійскіх улад пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Змены ў становішчы праваслаўнай царквы на беларускіх землях.

2. Царкоўнае кіраванне. Стан беларускіх праваслаўных епархій і іх устаноў.

3. Адносіны ўлад і праваслаўных іерархаў да стараабрадніцтва, адзінаверства.

4. Становішча уніяцкай царквы пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі. Полацкі царкоўны сабор.

5. Змены ў становішчы каталіцкай царквы ў XIX ст. Магілёўскае каталіцкае архібіскупства. Рыма-каталіцкая духоўная калегія і яе дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Змяншэнне ўплыву каталіцкай царквы пасля паўстанняў 1830 і 1863 гг.

6. Пратэстанцкія плыні на беларускіх землях Расійскай імперыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінары |
| 1 | Уводзіны | 1 | |
| 2 | Раннія формы вераванняў і культу. Язычніцтва на тэрыторыі Беларусі | 2 | 1 |
| 3 | Перадумовы ўзнікнення хрысціянства. Станаўленне веравучэння, культу, арганізацыі ў хрысціянстве | 2 | |
| 4 | Прыняцце хрысціянства на Русі | 2 | |
| 5 | Хрысціянства на тэрыторыі Беларусі (X – XIII стст.) | 2 | 1 |
| 6 | Праваслаўная царква ў ВКЛ (сярэдзіна XIII – XVI стст.) | 3 | 1 |
| 7 | Каталіцкая царква ў ВКЛ (сярэдзіна XIII – XVI стст.) | 2 | |
| 8 | Рэфармацыя і Контррэфармацыя ў ВКЛ | 3 | 1 |
| 9 | Брэсцкая царкоўная унія. Уніяцтва на беларускіх землях | 3 | 2 |
| 10 | Гісторыя стараабраднііцтва на Беларусі | 2 | 2 |
| 11 | Хрысціянскія канфесіі ў Рэчы Паспалітай | 4 | |
| 12 | Хрысціянскія канфесіі на беларускіх землях у складзе Расійскай імперыі | 4 | 2 |
| 13 | Царква і грамадства напярэдадні і ў час рэвалюцый 1917 г. | 2 | |
| 14 | Хрысціянскія канфесіі на Беларусі ў 1920–30-я гг. | 2 | 2 |
| 15 | Гісторыя рускай замежнай царквы | 2 | |
| 16 | Хрысціянскія канфесіі ў СССР і БССР у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войн | 2 | 2 |
| 17 | Хрысціянскія канфесіі ў СССР у 1950 – першай палове 1980-х гг. Катакомбная царква | 2 | |
| 18 | Хрысціянскія канфесіі і рэлігійнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | 2 |
| **УСЯГО:** | | **42** | **16** |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАНФЕСІІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Уключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі патрабавала ад царскага ўрада выпрацоўкі новай палітыкі ў дачыненні да гэтых зямель з улікам існаваўшага тут сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і канфесіянальнага становішча.Трэба было ўлічваць не толькі той факт, што акрамя беларусаў значную частку насельніцтва складалі палякі і яўрэі, але і тое, што жыхары далучаных тэрыторый належалі да розных рэлігійных канфесій: праваслаўя, каталіцызму, уніяцтва, іудаізму, пратэстантызму і ісламу.

Адносіны да прадстаўнікоў неправаслаўных канфесій будаваліся, асабліва ў першыя два дзесяцігоддзі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, з улікам таго, каб забяспечыць падтрымку ўраду з боку мясцовага насельніцтва. Таму Кацярына II загадала губернатарам абвясціць, што "всемилостивейшая государыня изволить не только всехъ (ея новых подданых) подтверждать при совершенной и ничем неограниченной свободе въ публичном отправлении ихъ веры... но изволитъ еще отныне награждать въ полной мере и без всякого изъятия теми правами и преимуществами, каковыми древния ея подданные пользуются" [1]. Разам з тым абсалютную падтрымку атрымала ад самадзяржаўя толькі праваслаўная царква. Гэта прыводзіла да павелічэння колькасці праваслаўных вернікаў і спрыяла поспеху палітыкі русіфікацыі края. Таму невыпадкова тая ж Кацярына II патрабавала ад пскоўскага і магілёўскага губернатараў, каб яны сачылі, "дабы католические и униатские епископы, каноники, приходские попы и всякого звания их духовныя отнюдь не дерзали ни под каким видом ни тайно, ни явно преклонять и обращать православных нашего греческого православия в другой закон" [2].

Увогуле адносіны царскага ўрада да царквы на працягу XIX ст., нягледзячы на афіцыйныя заявы аб неабмежаванай свабодзе ў публічным веравызнанні, будаваліся ў адпаведнасці з тым, што за рэлігіяй прызнавалася "главным образом политическое значение – род узды для народа" [3].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА

Напярэдадні першага падзелу Рэчы Паспалітай на Беларусі дзейнічала толькі адна праваслаўная епархія з епіскапскай кафедрай у г. Магілёве. Да 1765 г. на гэтых землях засталося ўсяго 130 праваслаўных храмаў [4]. З 1755 г. на чале Магілёўскай епархіі быў Георгій Каніскі. Дзякуючы яму ў Магілёве была адкрыта духоўная семінарыя і друкарня пры архірэйскім двары, пачалося будаўніцтва новага кафедральнага сабора. У 1762 г. Г. Каніскі прысутнічаў пры каранацыі Кацярыны ІІ і ў сваёй прамове прасіў заступніцтва імператрыцы для праваслаўных Рэчы Паспалітай. У 1765 г. Г. Каніскі атрымаў аўдыенцыю караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Ён меў грамату Кацярыны ІІ да караля, у якой яна прасіла захаваць былыя "права и достояния епископа". У прамове С. Панятоўскаму Г. Каніскі падрабязна спыніўся на сумным становішчы праваслаўных у Рэчы Паспалітай і падаў каралю мемарандум, складзены на падставе вялікай колькасці юрыдычных актаў і гістарычных дакументаў. Пазней гэтыя матэрыялы былі выдадзены на польскай мове пад назвай "Права и вольности жителей греческого исповедания в Польше и Литве". Зведаў ганенні з боку католікаў і сам Г. Каніскі. Так, у час яго наведвання г. Оршы манахі-дамініканцы і каталіцкія місіянеры пад час богаслужэння напалі на царкву." Вскочив до пятнадцати человек… одни из алтаря чрез окна, другие в самой церкве били людей, а вломившись чрез людей ко мне и ставши передо мною, накрыли шапками свои головы и ко мне разновидно оборачивались, последи же от порога начали кричать: мы есмы истинные христиане… ни выходить, ни шуметь, ни бить людей не преставали, то я… принужден был выйти из церкви в преследовании за мною нападателей с пистолетами и с обнаженными саблями, а потому и не быв в состоянии другую церквь посетить, уехал как скоро мог, из города", – пісаў Г. Каніскі ў данясенні Св. Сіноду.

Пасля ўключэння ў склад Расійскай імперыі праваслаўная царква атрымала дзяржаўную падтрымку і пачала хутка ўмацоўвацца. У 1778 г. была ўтворана епіскапская кафедра ў г. Слуцку для заходняй часткі Беларусі і Валыні. З павелічэннем колькасці праваслаўных беларусаў у выніку пераходу ў праваслаўе многіх уніятаў (і добраахвотнага і прымусовага далучэння) з'явілася патрэба ў павелічэнні колькасці епархій. Былі аднаўлены епіскапскія кафедры і створаны новыя. Указам ад 18 мая 1795 г. Полацкая губерня была далучана да Магілёўскай епархіі (з 1772 г. была



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ў складзе Пскоўскай епархіі). А з красавіка 1833 г. старажытнейшая праваслаўная епархія Беларусі ўказам Св. Сінода была адноўлена як Полацкая і Віленская. З 1840 г. Полацкая епархія пакінута ў межах Віцебскай губерні і атрымала назву Полацкая і Віцебская [5]. Да XX ст. на беларускіх землях налічвалася ўжо пяць епархій: Віленска-Літоўская, Гродзенска-Брэсцкая, Мінска-Тураўская, Магілёўска-Мсціслаўская і Полацка-Віцебская. Кожная з гэтых епрархій мела кафедру вікарнага епіскапа: у Коўне, Беластоку, Слуцку, Гомелі, Дзвінску.

Усе беларускія епархіі былі неад'емнай часткай Рускай праваслаўнай царквы, на чале якой быў Св. Сінод, утвораны імператарам Пятром I у 1700 г. пасля скасавання патрыяршаства. Сінадальная сістэма кіравання Рускай праваслаўнай царквой была прынята і зацверджана і ўсходнімі праваслаўнымі патрыярхамі (Канстанцінопальскім, Анціахійскім, Александрыйскім і Іерусалімскім). За Сінодам, як калегіяльным царкоўна-ўрадавым органам, была прызнана патрыяршаская ўлада. Такім чынам, становішча Рускай праваслаўнай царквы было не зусім кананічным, але ўсімі патрыярхамі прызнаным.

Унутрыцаркоўныя адносіны, як і адносіны царквы з грамадствам і з дзяржавай, рэгуляваліся ў Расійскай імперыі асобнай галіной права – царкоўным правам. У яго ўваходзілі кананічнае і дагматычнае права, а таксама грамадзянскае заканадаўства, якое тычылася царквы.

Склад Св. Сінода вызначаўся асобным рэгламентам і з цягам часу крыху мяняўся. З 1763 г. колькасць членаў Сінода была абмежавана трыма архіпастырамі, двума архімандрытамі і протаіерэем. Пастаяннымі членамі Сінода былі тры мітрапаліты (Санкт-Пецярбургскі, Маскоўскі і Кіеўскі), два протапрэсвітэры (ваеннага і прыдворнага духавенства) і, па запрашэнні, два епархіяльныя архірэі. Галоўным членам Сінода быў Пецярбургскі мітрапаліт, але пасады старшыні Сінода не існавала.

Прадстаўніком імператара ў Сінодзе быў обер-пракурор. Фактычна ён і кіраваў справамі царквы і Сінода. "Они (т.е. члены Синода) были только членами совещания, именовавшегося Святейшим Правительствующим Синодом, фактически же бывшага совещательным органом при полномочном правителе церкви – обер-прокуроре Св. Синода, управлявшем… на положении министра и в качестве такового входившем в состав Совета министров… Во всех отношениях он подчинялся главе государства – императору и лишь только не подчинялся иерархам



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Церкви, которые, наоборот, ему сами подчинялись", – пісаў мітрапаліт Антоній (Храпавіцкі) [6]. Такім чынам, Руская праваслаўная царква залежала ад дзяржавы. Ні адно сур'ёзнае пытанне па яе кіраванні не магло быць вырашана без узгаднення і ўхвалення імператарам, а на месцах – без узгаднення з адміністрацыяй губерняў і зямель.

Гэта залежнасць, татальны кантроль дзяржавы прывялі да таго, што імператар Павел I у 1797 г. абвясціў імператара Усерасійскага главой Рускай царквы. Гэты ўказ і ў далейшым не адмяняўся, хаця ім і не карысталіся. У адпаведнасці з такой сістэмай кіравання царквой была выпрацавана і спецыяльная формула пры выбарах епіскапаў: "По изволению Всепресветлейшаго и Самодержавнейшаго Великаго Государя Императора (имя рек), Самодержавца Всероссійскаго, Святейшій Правітельствующий Всероссійскій Синодъ благославляет вашу святыню быть епископом Богоспасаемага города..." [7].

У царкоўна-адміністрацыйных адносінах Расія падзялялася на царкоўныя акругі – епархіі, межы якіх, як правіла, супадалі з межамі губерняў. Да 60-х гг. XIX ст. іх налічвалася 57, а праваслаўнага насельніцтва – больш за 52 млн чалавек [8]. На чале кожнай епархіі быў епархіяльны архірэй, які ажыццяўляў сваю ўладу пры дапамозе духоўнай кансісторыі. Кансісторыя складалася з найбольш паважаных протаіерэяў і архімандрытаў, зацверджаных Сінодам. Звычайна ў склад кансісторыі ўваходзілі чатыры духоўныя асобы і некалькі свецкіх (у тым ліку і сакратар кансісторыі, які прызначаўся і падпарадкоўваўся обер-пракурору).

Кожная епархія складалася з благачыній. Благачынныя з ліку найбольш давераных і паважаных протаіерэяў акругі дапамагалі епіскапам і кансісторыям у наглядзе за духавенствам. У благачыннай акрузе звычайна налічвалася некалькі дзесяткаў прыходскіх цэркваў і прыходскіх святароў. Пры кожнай царкве існавала пасада псаломшчыка-рэгента. На яе прызначаліся свецкія асобы, якія добра ведалі царкоўнае чытанне і спевы, а таксама богаслужэбны статут. Вялікія прыходы мелі па два, а то і па тры святары і столькі ж псаломшчыкаў. Пры царкве існавала пасада панамара, які адначасова быў вартаўніком.

Праваслаўная царква захоўвала свой суд, мела шырокую сетку духоўных навучальных устаноў. Падрыхтоўка святароў пачыналася ў духоўных вучылішчах і працягвалася ў семінарыях. Затым самыя здольныя маглі паступаць у адну з чатырох існаваўшых у Расіі духоўных акадэмій.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Закон падзяляў духавенства на белае і чорнае (манаскае). Сярод кожнай з груп існавала строгая іерархія. Адной з асаблівасцей было тое, што вышэйшыя пасады па царкоўным ведамстве займалі прадстаўнікі чорнага духавенства (за выключэннем ваеннага ведамства). Чорнае духавенства ўключала мітрапалітаў, архіепіскапаў, епіскапаў, архімандрытаў, ігуменаў, ігуменняў жаночых манастыроў і простых манахаў. Па спецыфіцы служэння белае духавенства падзялялася на наступныя групы: прыходскае сельскае (самая вялікая катэгорыя), прыходскае гарадское, ваеннае, прытчы цэркваў пры расійскіх пасольствах, прыдворнае.

Прыходскае духавенства мела шэраг ільгот: не плаціла асабістых падацей, не несла рэкруцкай павіннасці, вызвалялася ад пастоя і пазямельнага падатку, мела права набываць нерухомасць, не падлягала цялеснаму пакаранню. Аднак становішча праваслаўных святароў, асабліва вясковых, было далёкім ад здавальняючага. Большасці з іх не хапала сродкаў, духавенства патрабавала пашырэння сваіх грамадзянскіх правоў, дазволу дзецям свабодна выходзіць з саслоўя і г.д. Патрабавала змен і становішча ў духоўных навучальных установах. Вось якія сведчанні аб навучэнцах прыводзіў "Русский заграничный сборник" у "Описании сельского духовенства": "Что он видел постоянно на квартире своей? Грязь и порок. Что он видел в училище? Ту же грязь. Что видел в начальниках и учителях? Злых и жестоких наемников, единственная цель действий которых – грабеж, смелый, непреследуемый и ненаказуемый; видел, что для учителя, часто нетрезвого, не существует ни закон, ни правда, ни совесть: что он безнаказанно казнит и милует… Вот что неотступно перед глазами его было целых шесть лет!" [9]. Абвастрэнне гэтых і некаторых іншых праблем вымусіла царскі ўрад пайсці на рэфармаванне царквы. Але адбылося гэта ўжо ў другой палове XIX ст.

Такім чынам было арганізавана царкоўнае жыццё ў Расійскай імперыі, у тым ліку і на далучаных беларускіх землях. Падтрымка ўлад выклікала значнае павелічэнне колькасці праваслаўных храмаў. Толькі ў Магілёўскай епархіі ў 1797–1798 гг. было 380 цэркваў і 12 манастыроў (9 – мужчынскіх і 3 – жаночыя) [10].

У канцы XIX ст. у Еўрапейскай і Азіяцкай Расіі было 65 епархій і адна дзейнічала ў Амерыцы (Сан-Францыска). Як і раней, кіраваў Расійскай праваслаўнай царквой Св. Сінод. У 1899 г. у яго склад уваходзілі 5 членаў: мітрапаліт Кіеўскі і Галіцкі Іанікій і мітрапаліт С.-Пецярбургскі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

і Ладажскі Антоній, Маскоўскі і Каломенскі Уладзімір; архіепіскапы: экзарх Грузіі, архіепіскап Карталінскі Флавіян, архіепіскап Наўгародскі і Старарускі Феагност; іерархі: Сергій, архіепіскап Уладзімірскі, Маркел (былы Полацкі) і Гурый, старшыня Вучылішчнага Савета пры Св. Сінодзе.

З 66 епархій трыма кіравалі мітрапаліты (С.-Пецярбургскай, Маскоўскай, Кіеўскай), 15 – архіепіскапы, 48 – епіскапы. Усіх іерархаў Рускай праваслаўнай царквы было 114. Самай шматлікай па колькасці вернікаў у Расіі была Вяцкая праваслаўная епархія. З епархій Паўночна-Заходняга краю – Мінская [11].

Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі Магілёўскую епархію ўзначальвалі: Георгій Каніскі, Афанасій Вальхоўскі, Афанасій Братаноўскі, Варлаам Шышыцкі (быў пазбаўлены сана за прысягу Напалеону І); Данііл Мірдамскі, Іосіф Стрэценскі, Павел Морэў, Гаўрыіл Гарадлоў, Смарагд Крыжаноўскі, Ісідор Нікольскі, Анатоль Мартыноўскі, Яўсевій Арлінскі, Віталь Грэчулевіч, Сергій Спаскі, Ірыней Орда, Яўген Шэрышылаў і Місаіл Крылоў. Епіскапамі Полацкімі і Віленскімі былі Смарагд Крыжаноўскі, Ісідор Нікольскі, а з 1840 г. епіскапамі Полацкімі і Віцебскімі – Васіль Лужынскі, Сава Ціхаміраў, Віктарыян Любімаў, Маркел Попель, Антанін Дзяржавін, Аляксандр Закkіс [12].

Як і іншыя епархіяльныя архірэі таго часу, магілёўскія і полацкія мелі шырокія паўнамоцтвы. Яны прызначалі членаў кансісторыі, павышалі па пасадах, выдавалі па ўласным меркаванні жалаванне, кантралявалі справаводства, назіралі за архівамі і паводзінамі духавенства і г.д. Па духоўным рэгламенце епархіяльныя архірэі павінны былі здзяйсняць паездкі па епархіі. Магілёўскі епархіяльны дом некаторы час (пры епіскапе Анастасіі) быў у выключным становішчы: яго маёнткі не былі секвестраваны ў казну, і ён вёў даволі складаную гаспадарку. Архірэйскі дом валодаў фальваркам з прыгоннымі сялянамі, меў карчму, млын, шмат плацаў і крам, а таксама перавоз праз Дняпро і г.д.

Вялікае значэнне надавалі магілёўскія і полацкія архірэі справе пад'ёму адукаванасці кліру. І зразумела, нізкі ўзровень адукацыі духавенства перашкаджаў пашырэнню ўплыву праваслаўнай царквы. Так, па загаду шаснаццатага епіскапа Магілёўскага Анастасія ад 1803 г. малапісьменныя дзякі павінны былі з'явіцца ў Чачэрскую школу для навучэння



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

па царкоўных кнігах чытанню і пісьму. А каб яны не ўхіляліся, спасылаючыся на адзіноту, хваробы, гаспадарчыя справы, страту даходаў, было прадпісана: "1. Всех церковнослужителей, кои мало грамоты умеют, брать в Чечерскую школу, где им и квартира с дровами вольная назначена; 2. Тех, кто не захотят обучаться, представлять для отослания в светскую команду, яко недостойных быть в духовной; 3. Обучающимся в школе на содержание их священники должны уделять надлежащую часть доходов" [13].

Як адзін з галоўных сродкаў пашырэння поспехаў праваслаўя ў Заходніх губернях разглядаліся народныя і царкоўнапрыходскія школы. У 1847–1850 гг. толькі ў Магілёўскай епархіі было каля 100 царкоўных школ, у якіх навучалася больш за 1300 вучняў [14]. Пры Буйніцкім манастыры быў адкрыты прытулак для "воспитания девиц духовного звания". З цягам часу ён быў пераўтвораны ў жаночае вучылішча духоўнага ведамства. Вялікую ўвагу гэтай установе надавалі Магілёўскія епіскапы. Так, епіскап Анатоль у 1846 г. павялічыў сродкі на ўтрыманне сірот да 670 рублёў у год, пабудаваў для іх асобны дом са шпіталем, лазняй і іншымі службамі. Значна палепшана было і навучанне. У 1847 г. тут выкладалі Закон Божы, славянскае і рускае чытанне, чатыры дзеянні арыфметыкі, пісьмо і рукадзелле. Хутка дадаліся геаграфія і нотныя спевы. Гадзіны паміж гэтымі дысцыплінамі размяркоўваліся наступным чынам: рукадзелле – 22 г у тыдзень, чытанне па-руску – 15, па-славянску – 5, пісьмо – 5 г. У старэйшых класах вывучаліся: свяшчэнная гісторыя – 4 г, арыфметыка – 2 г, пісьмо – 2 г, нотныя спевы – 2 г, геаграфія – 7 г, катэхізіс – 1 г, вучэнне на лічыльніках – 1 г [15].

Шмат увагі надавалі магілёўскія епіскапы Магілёўскай семінарыі. На чале семінарыі было праўленне, якое складалася з рэктара, прэфекта, суперінтэнданта (потым яго замяніць інспектар) і аднаго з настаўнікаў. Выкладчыкі ў семінарыю прызначаліся епіскапам па дакладу праўлення. Акрамя заробку яны карысталіся кватэрамі, а некаторыя і харчам. Выкладчыкі павінны былі складаць рапарты аб ходзе навучання. З 1798 г. у Магілёўскай семінарыі былі ўведзены падручнікі на рускай мове замест польскіх. Семінарскае праўленне займалася і пытаннямі архірэйскага хору і аркестра. Існавала пры семінарыі і бібліятэка. Разам з тым семінарысты сустракаліся са шматлікімі цяжкасцямі: жорсткая дысцыпліна, надзвычайная галеча і даволі часта непадрыхтаванасць да навучання. Гэта, а таксама звычайнае гультайства, прымушала іх

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звяртацца за дазволам аб звальненні. Таму некаторыя вучні ўтрымліваліся ў семінарыі прымусова, а з вакацый часам іх вярталі суровымі мерамі, нават секлі розгамі [16]. Трэба заўважыць, што ў грамадстве, асабліва напярэдадні буржуазных рэформ, шмат крытыкі выказвалася і наконт зместу семінарскай адукацыі і неабходнасці яе ўдасканалення. "Смотрим в программу семинарского образования, – и что же видим? Богословие, Философия, Риторика, Математика, Физика, Астрономия, Медицина и пр. и пр. Ясно, что из ученика хотят сделать немножко богослова, немножко философа, немножко ритора, астронома, медика. А что должно выходить по суду здравого смысла и по свидетельству опыта на самом деле? Да ровно ничего. В деле образования немножко граничит с ничем" [17].

У другой палове XIX ст. у жыцці Рускай праваслаўнай царквы адбыліся значныя змены, якія закранулі і царкоўнае жыццё Паўночна-Заходняга краю. Адны з даследчыкаў разглядаюць іх як шэраг пераўтварэнняў, выкліканых буржуазнымі рэформамі 60–70-х гг. (Е.Ф. Грэкулаў, Б.Г. Літвак). Другія – як царкоўную рэформу, якая стаяла ў шэрагу іншых пераўтварэнняў Александраўскай эпохі (С.У. Рымскі). Так ці інакш, напярэдадні пераўтварэнняў духоўнае саслоўе ў Расіі было значна адасоблена ад іншых слаёў грамадства. Даволі востра стаяла пытанне аб матэрыяльным забеспячэнні святароў (асабліва вясковых). Складаным быў і псіхалагічны стан многіх прадстаўнікоў духавенства: з аднаго боку, яны па правах і адукацыі набліжаліся да дваранства; з другога – ні для вышэйшых саслоўяў, ні для сялян і мяшчан яны не былі "сваімі".

У тым, што праваслаўная царква – неад'емная частка грамадскага жыцця і што яна адчувае значныя цяжкасці і ёй патрэбна дапамога, была ўпэўнена большая частка расійскага грамадства. Ужо падчас адмены прыгоннага права гучалі прапановы аб паляпшэнні становішча царквы, у тым ліку матэрыяльнага. Прыходскі святар у залежнасці ад колькасці прыхаджан атрымліваў 100–200 рублёў. А пры сярэднім складзе сям'і ў 8 чалавек яму толькі на мінімальныя патрэбы, па некаторых падліках, неабходна было каля 650 рублёў штогод [18]. Прапановы былі розныя: прызначаць жалаванне святарам з дзяржаўнай казны, увесці невялікі абавязковы падатак на карысць царквы, даць ёй зямлю і г.д.

Ініцыятарам рэформы стаў міністр унутраных спраў П.А. Валуеў. Цікава, што як адзін з пераканаўчых аргументаў у запісцы цару ад 18 жніўня 1861 г. ён выкарыстоўвае факт гаротнага становішча праваслаўнага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

духавенства ў заходніх епархіях. Гэтым быў незадаволены і цар. Аляксандр II яшчэ да гэтага ўтварыў губернскія і цэнтральныя камісіі, каб умацаваць становішча праваслаўнай царквы ў Заходнім краі. Але прынцыповых змен не адчувалася. Валуеў сцвярджаў, што праблему трэба вырашаць у маштабах усёй імперыі і што ў Заходнім краі нічога не зменіцца, "пока в самом средоточии государства это же самое духовенство останется в том положении и на том уровне, на котором оно нынче находится" [19].

Пасля кансультацый з мітрапалітам Маскоўскім і Каломенскім Філарэтам, перамоў з іншымі ўплывовымі членамі Сінода (усё рабілася са згоды Аляксандра II) быў падрыхтаваны спіс членаў асобага ўрадавага камітэта з духоўных і свецкіх асоб – прысутствія. 6 жніўня 1861 г. быў зацверджаны ўказ, згодна з якім асноўнымі мэтамі рэформы сталі: павелічэнне сродкаў матэрыяльнага забеспячэння прыходскага духавенства, пашырэнне яго асабістых грамадзянскіх правоў, дазвол дзецям духавенства свабодна выходзіць з саслоўя, забеспячэнне духавенству ўдзелу ў народнай адукацыі. Старшынёй прысутствія стаў мітрапаліт Ісідор. Ад урада ў яго ўвайшлі: начальнік III аддзялення, міністр унутраных спраў, міністр дзяржаўнай маёмасці, обер-пракурор і дырэктар Упраўлення духоўнымі навучальнымі ўстановамі пры Сінодзе князь С.Н. Урусаў. Усе рашэнні дакладаліся непасрэдна цару.

Прысутствіе вырашыла дзейнічаць па схеме рыхтаваўшых сялянскую рэформу і звярнуцца за неабходнай інфармацыяй і прапановамі на месцы. Была зацверджана і праграма пытанняў. Каб скласці дакладнае ўяўленне аб матэрыяльным становішчы духавенства, патрабаваліся звесткі аб усіх крыніцах даходаў, аб колькасці прыхаджан іх прыходаў, аб аддаленасці населеных пунктаў ад царквы і прапановы аб магчымых крыніцах павышэння забяспечанасці. Па грамадзянскіх справах трэба было ўказаць на абмежаванні сямейных, саслоўных, службовых, маёмасных і іншых правоў і тое, якія льготы патрэбны і чаму. І нарэшце, неабходна было прадставіць інфармацыю аб школах і ўдзеле прыходаў у іх дзейнасці.

Даволі хутка на месцах утварылі губернскія прысутствія с першых асоб царкоўнай і грамадзянскай адміністрацыі. Але вырашэнне асноўных пытанняў рэформы расцягнулася на гады.

З мэтай паляпшэння матэрыяльнага становішча духавенства ўзраслі дзяржаўныя расходы на царкву. Так, у 1861 г. дзяржава выдзяляла на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

патрэбы праваслаўнай царквы 5 028 364 рублі, а ў 1881 г. – 10 321 265 рублёў. Аднак калі падлічыць, колькі выходзіць на адзін прыход, атрымаецца невялікая лічба – 300 рублёў. Трэба падкрэсліць, што па палітычных меркаваннях на патрэбы царквы ў Заходніх губернях выдзялялася больш [20]. Зборам сродкаў і ўрэгуляваннем канфліктаў паміж царквой і прыхаджанамі займаліся і прыходскія папячыцельствы. Яны выбіраліся прыхаджанамі, а кіраўніцтва здзяйсняў святар. Але створаны папячыцельствы былі далёка не ва ўсіх прыходах. Праз пятнаццаць гадоў – толькі ў 1/3 іх частцы. Звязана гэта было і з адносінамі да духавенства, а яшчэ ў большай ступені – са згаленнем сялян у парэформенную эпоху. Сярод іншых сродкаў вырашэння праблемы былі: нарэзка цэрквам зямлі, дазвол епархіям набываць нерухомасць, скарачэнне прытчаў, павелічэнне пенсійнага фонду, адкрыццё таварыстваў узаемнай дапамогі, бальніц, багадзельняў, прытулкаў. Аднак прынцыпова становішча духавенства ў канцы XIX ст. не змянілася.

Згодна з рэформай ліквідавалася і саслоўная замкнёнасць духавенства. Па закону 1869 г. дзеці духавенства атрымалі права выходзіць з саслоўя і свабодна выбіраць сферу дзейнасці. Пры гэтым за імі захоўваліся некаторыя льготы: свабода ад падацей і рэкрутчыны, правы дваран ці ганаровых грамадзян. Павялічылася колькасць дзяцей духавенства ў вышэйшых навучальных установах. Так, у 1875 г. 46% студэнтаў расійскіх універсітэтаў складалі менавіта дзеці святароў [21].

З 1867 г. уводзіўся новы "Устав и штаты православных семинарий и духовных училищ". У адпаведнасці з ім прадстаўнікі іншых саслоўяў атрымалі магчымасць навучацца ў духоўных навучальных установах. Навучальныя ўстановы духоўнага ведамства падпарадкоўваліся архірэям. У семінарыях уводзіліся выбары рэктараў. Разам з тым у семінарыях і акадэміях скарачалі ці адмянялі ўвогуле фізіку, матэматыку, астраномію, медыцыну і больш увагі надавалі спецыяльным дысцыплінам і педагогіцы (у сувязі з пашырэннем удзелу духавенства ў народнай асвеце).

Трэба звярнуць увагу на тое, што царкоўная рэформа была звязана і з іншымі пераўтварэннямі Аляксандраўскай эпохі. Белае духавенства атрымала права браць удзел у земскіх выбарах. Больш жорсткай стала царкоўная цэнзура. Адбыліся пэўныя змены і ў кіраванні царквой. Так, былі пашыраны правы архірэяў па кіраванні епархіямі. Духавенства атрымала права збірацца на з'езды, якія праводзіліся па благачынных акругах, па вучылішчных акругах і па епархіях.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Як і іншыя рэформы, царкоўная рэформа праводзілася непаслядоўна і была рэалізавана часткова. А з наступленнем рэакцыі пасля забойства Аляксандра II у 1881 г. зроблены былі крокі па яе абмежаванні. Аднак, нягледзячы на гэта яна, безумоўна, мела вялікае значэнне.

Як і раней, праваслаўныя іерархі, у тым ліку магілёўскія і полацкавіцебскія епіскапы, клапаціліся аб умацаванні пазіцый праваслаўя ў краі. Так, дваццаць чацвёрты Магілёўскі епіскап Анатоль, дзейнасць якога супала з узмацненнем "лаціна-польскай прапаганды" напярэдадні паўстання 1863–1864 гг., каб паспяхова супрацьстаяць каталіцкаму ўплыву, не толькі займаўся рознымі практычнымі справамі, але і змагаўся з ім зброяй слова. Сведчанне таму – два яго сачыненні: "Вера, Надежда и Любовь, изложенные в беседах и размышлениях с присовокуплением духовных стихотворений" і "Об отношении римской церкви к другим христианским церквам и ко всему человеческому роду". За гэтыя працы епіскап Анатоль атрымаў вучоную ступень доктара багаслоўя.

Шмат намаганняў прыклаў дваццаць чацвёрты магілёўскі епіскап для вяртання ў праваслаўе вернікаў, якія перайшлі ў каталіцтва. З гэтай нагоды выкарыстоўваліся і вызавы ў духоўную кансісторыю, і пасыланне да "совращенных" добранадзейных святароў. Вялікія надзеі ўскладаліся і на апублікаванне гістарычных дакументаў, якія б сведчылі пра старажытнасць праваслаўя ў гэтых мясцінах і аб перажытых ад католікаў і уніятаў ганеннях. Як адзін з дзейсных сродкаў епіскап Анатоль разглядаў русіфікацыю краю: "Вопиющая потребность состоит в том, чтобы глубоко посадить в ум и сердце поселян западных губерний, что они русские, что их народность родственная великороссийской, что если они в прежние времена были угнетены, то единственно от порабощения сословием людей, чуждых православной церкви" [22]. Гэтыя намаганні знайшлі падтрымку і высокую ўзнагароду ўлад. Епіскап Магілёўскі Анатоль быў узнагароджаны ордэнам Св. Уладзіміра II ступені, ордэнам князя Аляксандра Неўскага, пасвяціўся ў сан архіепіскапа, быў ганаровым членам Кіеўскай духоўнай акадэміі.

Даволі рашуча дзейнічаў напярэдадні і ў час паўстання 1863–1864 гг. епіскап Яўсевій. Калі пачалося паўстанне, ён знаходзіўся ў Пецярбургу як член Св. Сінода па справах епархіі. Атрымаўшы дазвол на часовае звальненне дамоў, ён у самы разгар паўстання здзяйсняе паездку па епархіі і робіць гэта так удала, што генерал-губернатар Мураўёў прасіў падоўжыць яго звальненне [23].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пры дваццаць шостым Магілёўскім епіскапе Віталіі была адноўлена дзейнасць Магілёўскага Богаяўленскага брацтва (1883 г.). Ганаровым членам брацтва быў і обер-пракурор Св. Сінода К.П. Пабеданосцаў. Сам імператар падараваў на гэтую справу 1 000 рублёў [24]. Мэтамі дзейнасці Магілёўскага Богаяўленскага брацтва сталі распаўсюджванне пісьменнасці, духоўнай асветы, а таксама дапамога тым, хто мае патрэбу. Выкладчык Магілёўскай духоўнай семінарыі І.І. Барнатны на ўрачыстасцях з нагоды 16-й гадавіны брацтва 4 красавіка 1899 г. адзначаў: "Ныне существующее в нашем городе Братство, во исполнение отеческих заветов приняло на себя именно эту, подсказанную самой жизнью, задачу – просвещать религиозное и патриотическое сознание народа нашего. Для этой цели оно распространяет книги, брошюры и картины духовно-нравственного и религиозно-исторического содержания; учреждает на свои средства целые библиотеки и склады таких книг и изданий, заводит подобные же библиотеки подвижные, содействует устроению всякого рода чтений и собеседований по вопросам религиозным и патриотическим и т.п." [25].

У канцы 90-х гг. XIX ст. Магілёўскае царкоўна-праваслаўнае Богаяўленскае брацтва аб'ядноўвала 451 чалавек (без уліку двух адзяленняў), з іх 5 – пажыццёвых, 8 – ганаровых і 146 – сапраўдных [26]. Брацтва займалася справамі бібліятэк Магілёва і царкоўнапрыходскіх школ Магілёўскай епархіі, раздачай цэрквам і народу кніг, брашур, лістоў рэлігійнага зместу, упрыгожваннем храмаў епархіі, арганізацыяй прытулку-школы і г.д. Толькі ў 1898 г. было набыта 481 кніга, 363 назваў і 10 часопісаў [27].

Пры епіскапе Віталіі магілёўскае духавенства атрымала і сваё перыядычнае выданне (з 1 ліпеня 1883 г.) – "Магілёўскія епархіяльныя ведамасці", на старонках якога адлюстроўвалася жыццё епархіі, духавенства абмяркоўвала цікавіўшыя яго пытанні. Кожны нумар праглядаўся самім епіскапам. Шмат увагі надавала выданне і стану асветы ў губерні. Зразумела і ўвага да Магілёўскай духоўнай семінарыі. Дзякуючы епіскапу Віталію семінарыя атрымала сваю царкву. Раней яе вучні хадзілі на богаслужэнне ў брацкі манастыр. У канцы XIX ст. рэктарам Магілёўскай семінарыі быў протаіерэй Уладзімір Міхайлавіч Успенскі, сын святара Тамбоўскай губерні, які працаваў выкладчыкам з 1876 г., а Магілёўскую семінарыю ўзначаліў у 1897 г. Яго дзейнасць была адзначана ордэнамі Св. Станіслава III і II ступені і Св. Ганны III ступені.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Інспектарам у гэты час быў Міхаіл Іванавіч Савацкі, магістр багаслоўя, узнагароджаны ордэнамі Св. Станіслава і Св. Ганны III ступені. У семінарыі выкладалі: Свяшчэннае Пісанне, багаслоўе (асноўнае, дагматычнае і маральнае), царкоўную і біблейскую гісторыю, гісторыю рускай царквы, гісторыю і выкрыццё расколу, літургіку і практычнае кіраўніцтва для пастыраў, рускую славеснасць і гісторыю літаратуры, усеагульную і рускую гісторыю, логіку, псіхалогію, філасофію, дыдактыку, фізіку, матэматыку, нямецкую, лацінскую, грэчаскую і яўрэйскую мовы [28].

У семінарскім Спаса-Праабражэнскім храме ў канцы XIX ст. праводзіліся рэлігійна-маральныя чытанні. Яны былі не толькі дазволены, але і благаслоўлены обер-пракурорам Св. Сінода. Расклад народных чытанняў уключаў не толькі "Жыціі", але і размовы аб богаслужэнні ў праваслаўнай царкве, аб святым храме, аб святых рэчах, цудатворных іконах, аб святах і асаблівасцях святочных богаслужэнняў, аб пастах, аб таінствах і г.д. [29].

У Магілёўскай епархіі акрамя семінарыі працавалі 5 духоўных вучылішчаў: Магілёўскае, Аршанскае, Мсціслаўскае, Гомельскае, а таксама Магілёўскае жаночае вучылішча духоўнага ведамства. У вучылішчах вывучалі рускую, царкоўна-славянскую, грэчаскую і лацінскую мовы, арыфметыку, геаграфію, царкоўныя спевы і чыстапісанне. У Магілёўскім жаночым вучылішчы акрамя пералічаных прадметаў выкладалі музыку, рукадзелле, гімнастыку, маляванне, французскую мову. Апошнюю выкладала з 1893 г. швейцарская падданая Марыя Гюрні [30].

Клапаціліся праваслаўныя іерархі і аб шматлікіх царкоўнапрыходскіх школах. У 1889 г. на 1 102 377 вернікаў праваслаўнай епархіі, з якіх 96 305 хлопчыкаў і 93 100 дзяўчынак школьнага ўзросту, вучні размяркоўваліся паміж навучальнымі ўстановамі наступным чынам: школы граматы – 13 310 хлопчыкаў і 892 дзяўчынкі, вучылішчы Міністэрства народнай асветы – 9 823 хлопчыкі і 1 418 дзяўчынак. Усяго працавала 5 хлапчуковых школ, 3 – для дзяўчынак і 1 102 змешаныя царкоўнапрыходскія школы і школы граматы. Аднак у 54 прыходах епархіі ўвогуле не было царкоўнапрыходскіх школ [31].

Выкладчыкамі працавалі тыя, хто скончыў духоўныя семінарыі і вучылішчы, гімназіі і прагімназіі, двухкласныя царкоўна-вучыцельскія школы, настаўніцкія семінарыі, народныя вучылішчы, а таксама асобы з хатняй адукацыяй. Зразумела, не ў баку былі і святары, якія даволі часта выконвалі абавязкі настаўнікаў без грашовай узнагароды [32].



дзяржаўнага
універсітэта
імя А. А. Куляшова

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сродкі на ўтрыманне царкоўнапрыходскіх школ паступалі з розных крыніц. Аднак пераважна збіраліся сялянамі па прыгаворах сялянскіх абшчын ці па ўзаемнай згодзе. Акрамя гэтага, сяляне дапамагалі дровамі, харчам, настаўнікі часам па чарзе сталаваліся ў іх, яны ж і рамантавалі памяшканні. Частка сродкаў паступала ад папячыцеляў і дабрачынцаў.

Па афіцыйных звестках Магілёўскай духоўнай кансісторыі, Магілёўская епархія да 1899 г. была падзелена на 38 благачынных акруг, у якіх было 822 царквы (182 каменныя і 637 драўляных). Усе цэрквы падзяляліся на: саборныя – 7, манастырскія – 26, прыходскія – 502, пры казённых установах – 8, дамавыя – 3, могільнікавыя – 94, прыпісныя – 146, капліцы і малітоўныя дамы – 36. Духавенста епархіі складалася з 26 протаіерэяў і 532 святароў. Па адукацыі протаіерэі і святары размяркоўваліся наступным чынам: 6 скончылі духоўныя акадэміі, адзін – універсітэт, не скончылі поўнага курса семінарыі – 55, астатнія прайшлі поўны курс у духоўных семінарыях.

У канцы XIX ст. у Магілёўскай епархіі існавала 6 мужчынскіх і 3 жаночыя манастыры. Першакласнымі былі Магілёва-Брацкі Богаяўленскі мужчынскі і Аршанскі Успенскі жаночы манастыры.

Паства епархіі складалася з 1 422 041 душы, з якіх 708 961 – мужчыны, 713 080 – жанчыны. За 1898 г. далучыліся да праваслаўя 3 раскольнікі-папоўцы, 2 раскольнікі-беспапоўцы, 7 католікаў, 6 лютэран, 25 іудзеяў [33].

Усяго ў Паўночна-Заходнім краі ў 90-х гг. XIX ст. існавала 4 епархіі: Магілёўская, Полацкая, Мінская і Літоўская (уваходзілі Ковенская, Гродзенская і Віленская губерні). Толькі саборных і прыходскіх цэркваў было 1 816, мужчынскіх і жаночых манастыроў – 33, царкоўнапрыходскіх школ – 779. У духоўных семінарыях навучаліся 863 чалавекі, у духоўных вучылішчах – 1 940 (у тым ліку жаночых духоўнага ведамства) [34].

Па перапісе 1897 г. з 1 686 764 жыхароў Магілёўскай губерні 1 402 161 былі праваслаўнымі [31]. 55,44% насельніцтва Віцебскай губерні таксама належалі да праваслаўнай канфесіі. У абсалютных лічбах гэта – 825 601 чалавек з 1 489 246 жыхароў губерні [35].

Такім чынам, умацаванне пазіцый праваслаўнай царквы ішло рознымі шляхамі: будаваліся і рамантаваліся праваслаўныя храмы, расла колькасць і адукаванасць духавенства, павялічваўся ўплыў царквы на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

народную асвету, актыўна ствараліся царкоўныя праваслаўныя школы і, зразумела, не без падтрымкі дзяржавы вярталіся ў праваслаўе уніяты.

Да канца XIX ст. колькасць праваслаўных вернікаў у Паўночна-Заходнім ўзрасла да 4 680 193 чалавек. Іншыя канфесіі былі не такімі шматлікімі: каталіцкая – 2 973 008, пратэстанцкая – 115 620 чалавек, іудзеяў было 1 515 642, магаметан – 14 253 чалавекі [36].

## УНІЯЦТВА

Адной з першых спраў і турбот Св. Сінода на далучаных землях Беларусі было перахрышчванне беларусаў-уніятаў. Ужо пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у праваслаўе вярнуліся два мільёны уніятаў, а за 1794–1797 гг. – больш за паўмільёна чалавек. Ёсць і іншыя лічбы. Так, архіепіскап Афанасій (Мартас) сведчыць, што "от августа 1794 года по март 1795 года, то есть за полгода, присоединились к православной церкви 1 483 111 униатов, 2 603 церкви и 1 552 священника" [37].

Трэба адзначыць, што поспех гэты не заўсёды вызначаўся жаданнем людзей, а даволі часта быў вынікам ужывання гвалтоўных сродкаў. Розныя аўтары, у залежнасці ад уласнай пазіцыі, аддаюць перавагу прыкладам ці добраахвотнага, ці гвалтоўнага далучэння уніятаў да праваслаўя. Але ў крыніцах ёсць і тыя і другія. Вось сведчанні па Магілёўскай і Віцебскай губернях. Архіепіскап Магілёўскі Гаўрыіл (Гарадлоў) пісаў архімандрыту Платону (Рудзінскаму) 6 чэрвеня 1836 г.: "Здесь (в Могилевской губернии) обращение иноверцев, особенно униатов, при помощи Божіей, совершается довольно успешно, хотя в меньшем количестве, нежели в Полоцкой епархии. В нынешнем году присоединено более десяти тысяч да в предшествовавшем сему году – около двадцати пяти тысяч". У рапарце епіскапа Полацкага Смарагда обер-пракурору Св. Сінода Нячаеву ад 29 ліпеня 1833 г. адзначана: "Напрасно полагают, будто бы униаты могут чинить беспокойства при обращении их в православие; по крайней мере по Витебской губернии я нашел униатов совершенно приготовленных к этому..."А вось іншы прыклад: "...18 декабря 1834 года приехали в Вилейку из Минска православные священники для обращения местных униатов, числом более 2 000 человек. Миссия не имела успеха. После этого по приказу минского вице-губернатора, русские солдаты в сопровождении полицейских чинов пригнали в Вилейку всех униатов из окрестных деревень и заставили присоединиться



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

к Православной церкви, а униатский священник был вывезен из Вилейки при помощи солдат" [38].

Нават раней "ліберальны" ў адносінах да уніятаў Павел I, з аднаго боку, забараняў рабіць якія б там ні было перашкоды ў адпраўленні уніятамі іх веры (пры ім былі ўтвораны дзве новыя уніяцкія епархіі – Брэсцкая і Луцкая), а з другога – ён жа загадаў схапіць і асудзіць сялян, якія скардзіліся на рэлігійны ўціск. Павел I выдаў у сакавіку 1791 г. указ "о непривлекании в католицизм и о нестеснении свободы присоединения к православию", ухваляў перадачу уніяцкіх храмаў праваслаўнай царкве. Так, у 1799 г. у рэскрыпце імператара на імя Полацкага уніяцкага архіепіскапа Лісоўскага прадпісвалася перадаць Віцебскі Успенскі базыльянскі манастыр у ведамства праваслаўнага епіскапа Анастасія: "...церковь обратить в собор православного исповедания... а прочее здание монастыря в управление Губернского Начальства... монахов перевесть в другой..." [39]. А вось прыклад іншага зместу: Павел I выказваў занепакоенасць у сувязі з тым, "почему некоторые приходы, присоединившиеся к православию, обнаруживают желание возвратиться снова в унию?" Мінскаму губернатару было загадана правесці дазнанне. Цікава, якія вынікі яно мела. Па-першае, у адказ на пытанне "чаму?" высветлілася, што сяляне разлічвалі на тое, што ў праваслаўе вернуцца ўсе іх адзінаверцы і тады не будзе ніякай крыўды і варожасці паміж жыхарамі адной мясцовасці. Па-другое, сяляне, якія вярнуліся ў праваслаўе, спадзяваліся на змяншэнне "всяческих податей и работы, что может быть обращающими неосторожно предлагаемо им было..." Акрамя таго, "ревнители обращения, записывая присоединившихся, включали в эти списки многих, ничего ровно об этом незнавших. Результатом этого было то, что в некоторых присоединенных приходах крестьяне совсем не ходили в церковь... возвращались в унию или принимали католичество." Звяртае на сябе ўвагу і яшчэ адна з прычын. Карнееў абвінавачвае прыбыўшых праваслаўных святароў "в грубом обращении их с народом, в попечении их об одной обрядности, в пренебрежении к проповеди, к чему привык народ..." Адначасова губернатар заўважае, што "католические и униатские попы пользовались великим уважением в народе, вполне ими заслуженном, по своей жизни и деятельности..." [40]. Беларусы-уніяты даволі доўга з павагай адносіліся да веры бацькоў. Вось чаму як толькі Павел I скасаваў указ аб прымусовым далучэнні уніятаў да праваслаўя, прыкладна 90% іх пажадалі вярнуцца да сваёй былой веры.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Крыху больш дэмакратычныя і гуманныя адносіны Паўла I і Аляксандра I да уніятаў прыйшліся не даспадобы і Св. Сіноду, і чыноўнікам, што паспелі ўжо ўладкавацца на службе ў Беларускім краі. Таму прыхільнікі палітыкі Кацярыны II у адносінах да уніятаў працягвалі свае захады па апрацоўцы іерархаў грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы. Такая палітыка дала свае вынікі. Так, уніяцкі мітрапаліт Лісоўскі загадаў у 1806 г. у час службы царскае імя ўпамінаць перад папскім, пачаў весці службы па архірэйскім служэбніку маскоўскага друку. На такіх жа пазіцыях стаяў і яго пераемнік архіепіскап Красоўскі. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што збліжэнне з праваслаўем было выклікана жаданнем не дапусціць, каб уніятаў канчаткова паглынула каталіцкая царква. А пагроза такая існавала ў сувязі з тым, што рускія царкоўныя і свецкія ўлады не прызнавалі беларускую мову ўвогуле і як мову набажэнства ў прыватнасці і таму лічылі, што можна перайсці на адкрыццё шырокага доступу польскай мове ў набажэнстве уніяцкай царквы.

Становішча уніяцкай царквы яшчэ больш ускладнілася ў сувязі з унутранай барацьбой паміж белым і манаскім духавенствам. Прадстаўнікі белага духавенства, аб'яднаўшыся ў капітулы, супрацьдзейнічалі уніяцкаму манаскаму ордэну (базыльянскаму) і абвінавачвалі яго ў пракаталіцкай арыентацыі, растраце духоўных капіталаў, заняпадзе адукацыі святароў, скажэнні грэчаскіх абрадаў. Абвінавачванні гэтыя мелі пад сабой падставу. Да ўказа 1807 г. у базыльянскі ордэн маглі ўступаць асобы рыма-каталіцкага веравызнання. І нават у 20-я гг. XIX ст. рыма-каталіцкая калегія паспрабавала прыняць пастанову "не воспрещать и впредь вступать в орден, как римско-католическим в греко-униатский базильянский, так равно и униатским – в римско-католический орден". Аднак па ўказанні кн. А.Н. Галіцына калегія вымушана была забараніць такія пераходы. Але і без таго ў Віцебскай губерні, напрыклад, настаяцелі ўсіх 7 уніяцкіх манастыроў да паступлення ў базыльянскі ордэн былі каталікамі, а з 62 манахаў 41 таксама раней былі каталіцкага веравызнання [41].

Нягледзячы на гэта, уніяцкая царква напрыканцы першай чвэрці XIX ст. налічвала 4 епархіі: Віленскую, Полацкую, Брэсцкую і Луцкую. Толькі ў Віленскай епархіі ў 1823 г. было 304 царквы, 350 святароў і 29 465 прыхаджан. У Брэсцкай – 549 цэркваў. Справамі уніяцкай царквы ў Расійскай імперыі кіраваў другі дэпартамент рыма-каталіцкай калегіі. Менавіта туды ў 1827 г. падаў сваю запіску протаіерэй і асэсар ад



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Луцкай епархіі Іосіф Сямашка. Запіска гэта стала адным з зыходных дакументаў для ліквідацыі уніі. У 1829 г. Сямашка пасвяціўся ў епіскапы Беларускія (Мсціслаўскія), а затым Літоўскія. Прэзідэнт Расійскай акадэміі навук гр. Д.А. Талстой у сувязі з дзейнасцю І. Сямашкі па скасаванні уніі адзначаў: "За последнее столетие нет в Западном крае более выдающейся личности, более государственного человека, как митрополит Иосиф" [42].

Пасля того як польскае паўстанне 1830–1831 гг. было падаўлена, узмацніўся ўплыў праваслаўя ў краі. На адміністрацыйныя пасады прызначаліся асобы толькі рускага паходжання, а на пасады святароў – выхаванцы рускіх і ўкраінскіх семінарый. Закрываліся і ператвараліся ў праваслаўныя многія базыльянскі манастыры. Шырока паступала на Беларусь рэлігійная літаратура з Масквы і Пецярбурга. Іосіф Сямашка аддаў загад знішчыць ва ўсіх уніяцкіх цэрквах Літоўскай епархіі старажытныя уніяцкія служэбнікі. Ён настойліва дамагаўся і хутчэйшага пераводу ўсіх прадметаў у духоўных семінарыях і вучылішчах з польскай на рускую мову, а таксама ўвядзення рускай мовы ў розныя формы уніяцкага царкоўнага справаводства. На рускай мове І. Сямашка вёў і перапіску з падначаленымі яму духоўнымі асобамі. На рускай мове пачалі запаўняць і метрычныя кнігі.

Урад быў зацікаўлены ў скасаванні уніі, і 13 студзеня 1834 г. адбыўся так званы Найвышэйшы наказ. У прыкладзенай інструкцыі праваслаўным епіскапам прадпісвалася пераводзіць уніятаў у праваслаўе асцярожна і няспешна. Уніяцкім святарам – неадкладна ачысціць царкву ад каталіцкіх абрадаў. У 1835 г. быў створаны сакрэтны камітэт па уніяцкіх справах. Камітэт прыняў пастанову аб аднаўленні і ўстанаўленні ва уніяцкіх храмах іканастасаў. Адкрытага супрацьдзеяння з боку простага люду гэта часцей за ўсё не выклікала. "Народ, неизменно называвший себя и свои церкви русскими, а католиков – поляками, слепо следовал своему духовенству и, ясно не понимая сущности реформ, объяснял их по-своему – тем, что прежние униацкие храмы, хотя и были русские, но теперь делаются "правдивыми" русскими. Иные же, после устройства иконостаса, уже считали себя "благочестивыми" (православными), наконец, некоторые утверждали, что прежнее их богослужение было русское холопское, а теперь вводится русское панское и даже осуждали своих пастырей за незнание настоящего "богослужения"", – пісаў Кіпрыяновіч [43]. Разам з тым "для предупреждения на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

месте неблагоприятных делу возсоединения движений" губернатары заходніх губерній былі "снабжены инструкциями и особыми полномочиями для немедленного пресечения в самом начале возможных беспорядков или противодействий со стороны панов или ксендзов". Акрамя таго, у Беларускую епархію для нагляду за становішчам быў пасланы камергер Скрыпіцын. Некаторыя уніяцкія святары і манахі былі высланы ў часовую абіцель у Курску, а найбольш упартыя – у вялікарасійскія манастыры [44].

Вярхі уніяцкай царквы, у прыватнасці епіскапы Лісоўскі і Красоўскі, мітрапаліт Кахановіч, падтрымалі ўрадавую палітыку далучэння уніяцтва да праваслаўя. Пасля смерці мітрапаліта І. Булгака і пінскага епіскапа І. Жарскага (1838 г.), заўзятых працiўнікаў праваслаўя, старшынёй грэка-каталіцкай калегіі стаў І. Сямашка. Але сярод святароў-уніятаў былі і прыхільнікі захавання уніі, якія адмаўляліся ставіць свае подпісы аб далучэнні да праваслаўя. Усяго адмовіліся даць подпісы 306 святароў і 77 манахаў Беларускай уніяцкай епархіі. Подпісы паставілі 330 святароў, 17 іераманахаў і манахаў, 22 сакратары і свецкія настаўнікі духоўных уніяцкіх вучылішчаў [45].

12 лютага 1839 г., сабраўшыся ў Полацку, епіскапы Іосіф Літоўскі, Васіль Полацкі, вікарны епіскап Брэсцкі Антоній і праваслаўны Полацкі епіскап Іосіф падпісалі так званы Саборны акт. У ім гаварылася: "...Церковь наша, от начала своего была в единстве святыя Апастальскія Православно-Кафолическія Церкви, которая Господом Богом и Спасом нашим Иисусом Христом на Восток насаждена, от Востока возсіяла міру и доселе цело и неизменно соблюла божественные догматы ученіе Христова, ничего к оному не прилагая от духа человеческага суемудрія. В сем блаженном и превожделенном вселенском союзе Церковь наша составляла нераздельную часть Греко-Российскія Церкви, подобно как предки наши, по языку и происхожденію, всегда составляли нераздельную часть русского народа. Но горестное отторженіе обитаемых намі областей и предков наших от истинного кафолическага единенія, и сила чуждага преобладанія подчинила их власти Римской Церкви под названием униатов". Далей ідзе апісанне пакут праваслаўных пад уладай Польшчы. І нарэшце гаворыцца: "Посему в теплых сердечных моленіях, призвав на помощь благодать Господа Бога и Спаса нашего Іисуса Христа и Святого и всесовершающего Духа, мы положили твердо и неизменно:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1. Признать вновь единство нашея церкви с Православно-Кафолическою Восточною Церковью и посему пребывать отныне, купно с вверенными нам паствами, в единомыслии со святейшими восточными православными патріархами и в послушаніи Святейшего Правительствующаго Всероссійского Синода.

2. Всеподданнейше просить благочестивейшаго Государя императора настоящее намереніе наше в своё Августейшее покровительство принять и исполненію онага к миру и спасенію душ Высочайшим своим благоусмотреніем и державною волею споспешествовать… " [46].

І. Сямашка накіраваў пастанову ў Св. Сінод. Обер-пракурор перадаў акт імператару. 25 сакавіка Мікалай зацвердзіў "Сінадальнае дзеянне", у якім змяшчалася пастанова аб зліцці уніяцкай царквы з праваслаўнай на тэрыторыі Беларусі і Украіны. Сямашка атрымаў сан архіепіскапа. Указ Сената аб уз'яднанні быў даведзены да ўсеагульнага ведама толькі ў кастрычніку 1839 года, калі былыя уніяты ўжо паспелі крыху звыкнуцца з новымі парадкамі ў іх рэлігійным жыцці.

Пытанне аб тым, жадае ці не народ перайсці з уніі ў праваслаўе, нікога не цікавіла. Каб зламіць апазіцыю радавых святароў, іх, па плане Сямашкі, пераводзілі з аднае епархіі ў другую, пазбаўлялі прыходаў, высылалі ў рускія губерні, знявольвалі ў манастырах.

Згодна з указам Св. Сінода ад 9 кастрычніка 1839 г., на былое уніяцкае духавенства распаўсюджваліся ўсе тыя пастановы, якія тычыліся праваслаўнага духавенства. Аднак радыкальныя змены ў поглядах і рэлігійных звычаях былых уніятаў не маглі адбыцца адразу.

У 1840 г. адбылося размежаванне епархій. Цэрквы і манастыры былых уніяцкіх Беларускай і Літоўскай епархій былі падзелены паміж Мінскай, Магілёўскай, Полацкай і Літоўскай праваслаўнымі епархіямі. Толькі па былой грэка-уніяцкай Беларускай епархіі 532 царквы і манастыры былі перададзены праваслаўнай царкве [47].

Аднак сам працэс пераходу былых уніятаў у праваслаўе доўжыўся 40–50 гадоў. Так, рэвізія цэркваў Літоўскай праваслаўнай епархіі ў 1850 г. паказала, што ў 12 благачынных акругах сярод святароў і членаў іх сямей былі асобы, якія не ведалі малітваў на царкоўнаславянскай мове, зразумела, не ведалі іх і прыхаджане [38]. У 1855 г. віцебскі, магілёўскі і смаленскі генерал-губернатар Ігнацьеў пісаў імператару, што былыя уніяцкія святары "не изменили прежних обычаев своих,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

с польским языком сохранили они все представления прежних своих наставников... Большая часть крестьян не только не знает ни одной молитвы. Но даже на вопрос: какой веры, отвечает: новой веры, и при дальнейшем объяснении прибавляет: прежде были польской, а теперь кажется русской" [48].

Значная колькасць униятаў "совращалась в латинство". І афіцыйныя ўлады яшчэ даволі працяглы час рабілі розніцу паміж старымі праваслаўнымі святарамі і зноўдалучанымі. Аб гэтым сведчыць ліст Літоўскага мітрапаліта Іосіфа да Св. Сінода ў сувязі з намерам запрасіць місіянераў з расійскіх епархій для ўзмацнення праваслаўя ў Паўночна-Заходнім краі [49].

І мітрапаліт Іосіф, і яго пераемнікі шмат зрабілі для пазбаўлення далучаных цэркваў "униатской старины", перавыхавання духавенства на праваслаўна-рускі лад, паляпшэння яго дабрабыту, аднаўлення і ўпрыгожвання храмаў. Аднак і ў 50-х, і ў 60-х гг. выкарыстоўваліся уніяцкія служэбнікі, многія простыя вернікі хрысціліся як католікі, ведалі і чыталі толькі польскія малітвы, малебны і паніхіды, а таксама вячэрні і ютрані адбываліся (да 1853 г.) даволі рэдка [50].

Заўзятую барацьбу за ўмацаванне ўплыву праваслаўя вёў і вядомы сваім удзелам у падрыхтоўцы уніі епіскап полацкі і віцебскі Васілі Лужынскі. За гэта ён быў узведзены ў сан архіепіскапа. За даволі працяглы час (перажыў 11 губернатараў) архіепіскап Васілі шмат садзейнічаў будаўніцтву і ўпрыгожванню храмаў, росту адукаванасці і святароў, і паствы. Аднак з яго ж "Запісак" відаць, што і ў 1855 г. большасць цэркваў (каля 300) "отличались от сельских общественных амбаров только крестом, поставленным на кровле. Во многих из них не было ни пола ни потолка, крыша от бедности просвечивала, иконостасы и церковная утварь поражали своей бедностью. Крестьяне не знали православных молитв. По недостатку церквей некоторые воссоединенные бывали в церкви только однажды в году, приходя на исповедь. В епархии находилось 140 священнослужителей, окончивших курс учения в Полоцкой семинарии, и более 100 полуобразованных старых, воссоединенных в 1839 г. священников" [51].

Падчас паўстання 1863–1864 гг. рабіліся захады, якія былі накіраваны на прыцягненне ў шэрагі паўстанцаў былых уніятаў. Здавалася, гэта мела рацыю, бо прайшло зусім нямнога часу з моманту далучэння уніяцкай царквы да праваслаўнай. Так, у Літоўскай епархіі было амаль

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

700 000 вернікаў "исключительно из воссоединенного народа и такового же духовенства". У Мінскай епархіі з 535 праваслаўных храмаў у 1860 г. 322 – былыя уніяцкія. У 10 уездах Магілёўскай губерні 183 царквы і манастыры – былыя уніяцкія. У межах Віцебскай губерні – 150 цэркваў і манастыроў [52]. Каб нейтралізаваць уплыў шматлікіх лістоў і адозваў паўстанцаў, мітрапаліт Іосіф рассылае сакрэтнае "окружное послание"да падначаленых яму духоўных асоб. За духавенствам пільна сачылі. У выніку: "Во время мятежа все воссоединенное духовенство Литовской епархии твердо стояло на страже православия и русской народности " [53].

Аднак праявы уніяцтва не згінулі і ў канцы XIX ст. Часцей за ўсё ў абрадавым выглядзе і ў схільнасці уніятаў да католікаў. Пра гэта сведчыць і той факт, што пасля прыняцця ўказа аб верацярпімасці (17 красавіка 1905 г.) пачаўся масавы пераход з праваслаўя ў каталіцызм.

Даследчыкі па-рознаму ставяцца да уніяцкай царквы і яе скасавання. Адны лічаць, што яна была нацыянальнай беларускай царквой таму, што большасць беларусаў належала менавіта да гэтай канфесіі. Другія прытрымліваюцца думкі, што ў наш час ствараецца міф аб уніяцтве як аб нацыянальнай рэлігіі і сцвярджаюць, што сапраўды нацыянальнай царквой была праваслаўная дауніяцкая царква, якая мела шасцісотгадовую гісторыю. Праваслаўныя святары лічаць, што наогул памылкова ўжываць багаслоўскі тэрмін "канфесія" адносна уніяцтва, бо канфесія – гэта веравызнанне, а уніяцтва не мае ніякага адрознення ў веравучэнні ад каталіцызму.

## КАТАЛІЦКАЯ ЦАРКВА

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння Беларусі да Расіі істотна змяніліся ўмовы дзейнасці каталіцкай царквы. Яна апынулася ў становішчы цярпімага, але не дзяржаўнага веравызнання.

Ужо пры першым падзеле Рэчы Паспалітай да Расіі былі далучаны тэрыторыі, на якіх жылі 100 000 католікаў, у асноўным з ліку шляхты. У апошняй трэці XVIII ст. на Беларусі было 277 каталіцкіх плябаній, 270 касцёлаў, дзейнічалі 18 мужчынскіх і 8 жаночых манаскіх ордэнаў, мноства кляштароў і г.д. [54].

На далучаных тэрыторыях дзейнічалі да падзелаў 4 рыма-каталіцкія епархіі: Віленская, Жмудская (Самагіцкая), Луцкая і Камянец-Падольская. Папа меў над каталіцкім духавенствам амаль неабмежаваную ўладу, якую ён здзяйсняў праз свайго нунцыя ў Варшаве [55].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Кацярына II у сваіх указах падчас падзелаў запэўнівала аб неабмежаванай свабодзе ў веравызнанні, што павінна было адбіцца на настроях далучанага насельніцтва і выклікаць давер і прыхільнасць да царскай улады. Аднак адразу ж пачаліся захады ўрада па падпарадкаванні каталіцкай царквы дзяржаве.

22 лістапада 1773 г. загадам Кацярыны II была ўтворана Беларуская каталіцкая епархія з цэнтрам у г. Магілёве, у 1783 г. – Магілёўскае архіепіскапства на чале з С. Богуш-Сестранцэвічам, кампетэнцыі якога падлягалі ўсе католікі – грамадзяне Расійскай імперыі і ўсе каталіцкія прыходы.

Архіепіскапу Магілёўскаму было прызначана жалаванне 10 000 рублёў (усяго Богуш-Сестранцэвіч атрымліваў каля 60 000 рублёў у год). Епіскапы атрымалі па 3–4 тысячы рублёў у год [56]. Утварэнне Магілёўскай каталіцкай епархіі і прызначэнне Богуш-Сестранцэвіча не было ўзгоднена з Ватыканам, які прызнаў гэтыя крокі расійскіх улад пасля заўзятай барацьбы толькі ў 1784 г.

Імкненнем Ватыкана не пашкодзіць католікам на далучаных землях была прадыктавана і яго маўклівая згода на існаванне ў Расіі ордэна езуітаў, скасаванага Папам Кліментам XIV 21 ліпеня 1773 г. Кацярына II вельмі хутка адмовілася ад супрацьезуіцкай палітыкі і не толькі не скасавала ордэн, але і падтрымлівала і апякала яго. Гэта было вынікам не толькі прысягі езуітаў, праслаўлення імі імператрыцы, значнай ролі іх у школьнай справе, але і імкненнем паказаць Ватыкану ўласную сілу. Падчас кіравання Кацярыны II ордэн езуітаў меў 6 калегій: Полацкую, Дзвінскую, Магілёўскую, Мсціслаўскую, Аршанскую і Віцебскую, 10 місій, 2 навіцыянскія дамы. Лічба сяброў ордэна дасягала 200. Ордэн валодаў 14 000 сялян, некалькімі фабрыкамі і заводамі, млынамі і г.д. Багацці езуітаў складалі больш за тры мільёны рублёў. Кацярына II не толькі не пазбавіла іх маёмасці, але і падтрымлівала іх матэрыяльна [57].

Пры пераемніку Кацярыны II Паўле I пазіцыі католікаў яшчэ больш узмацніліся, чаму спрыяў уплыў на імператара з боку езуіта Грубера. Менавіта Павел I звярнуўся да Папы Пія VII з просьбай зацвердзіць ордэн езуітаў у межах Расійскай імперыі, што было зроблена ў сакавіку 1801 г. Колькасць езуітаў пад канец праўлення Паўла I павялічылася да 244 чалавек. У самым пачатку свайго праўлення Павел I выдаў шэраг пастаноў, якія супярэчылі зробленым раней Кацярынай II. У Варшаве нават пачалі гаварыць, што імператар збіраецца адрадзіць Польшчу "в



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

скромных пределах". Аднак слушным падаецца меркаванне аб тым, што "ровно ничем… не заявил он своего желания отказаться от приобретений, справедливо доставшихся России после всех разделов… Все, в чем можно упрекнуть его, – это в видимой, но конечно бессознательной, замене органического слияния простым государственным присоединением территориальных приобретений к России" [58].

У час праўлення Аляксандра I каталіцкая царква і яе духавенства карысталіся ў Расіі цярпімасцю і падтрымкай. Імператар асабіста не быў прыхільным да езуітаў, але дзякуючы кн. Галіцыну, гр. Растопчыну, кн. Качубею і кн. Чартарыйскаму яны яшчэ больш умацавалі свае пазіцыі. Разумны і ўплывовы Грубер (1802–1805 гг.), а потым актыўны і хітры Бржэзоўскі зрабіліся генераламі ордэна. Колькасць езуітаў узрасла да 350 чалавек. Усе іх школы былі вызвалены ад урадавага нагляду і падпарадкаваны Полацкай езуіцкай калегіі, пераўтворанай у 1812 г. у акадэмію [59]. Падчас нашэсця Напалеона I на Расію многія католікі, у тым ліку і духавенства, падтрымалі яго. Не выказвалі спачування рускім войскам і езуіты. Указам Аляксандра I ад 20 снежня 1815 г. езуіты высылаліся з Пецярбурга, ім забаранялася наведванне Масквы. А 13 сакавіка 1820 г. быў выдадзены ўказ, згодна з якім манахаў ордэна езуітаў загадвалася высылаць за межы дзяржавы.

Аляксандр I напрыканцы свайго праўлення некалькі абмежаваў уплыў католікаў, вызваліў уніятаў ад іх залежнасці і стаў падтрымліваць "русские силы" ў краі.

Аднак на тэрыторыі Беларусі акрамя ордэна езуітаў дзейнічалі і іншыя каталіцкія манаскія ордэны. Так, у 1831 г. у Віцебску былі кляштары ордэна дамініканцаў (5 манахаў), бернардзінцаў (12), трынітарыяў (4), у Полацку – дамініканцаў (5), францысканцаў (7), бернардзінцаў [16]. У так званым Паўночна-Заходнім краі пры каталіцкіх кляштарах было каля 40 польскіх школ: 14 – для свецкіх юнакоў, 12 – для навіцыятаў, 10 – піярскіх, 9 – дамініканскіх, 2 – францысканскіх, 1 – аўгусцініянская і інш. [60].

Але трэба падкрэсліць, што ў часы Кацярыны II і Паўла I (і чым далей, тым больш) праяўлялася імкненне царскага ўрада да змяншэння ўплыву каталіцкага касцёла на насельніцтва і іншыя канфесіі.

Адразу ж пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі Папскія булы забаранялася абвяшчаць без дазволу царскага ўрада, ордэны і кляштары былі выведзены з-пад юрысдыкцыі генералаў, якія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

знаходзіліся за межамі імперыі. Забаранялася пашыраць каталіцкую веру ў новай дзяржаве.

Вышэйшы кантроль за дзейнасцю каталіцкай царквы ажыццяўляла Юстыц-калегія, у якой у 1797 г. быў заснаваны спецыяльны дэпартамент пад старшынствам рыма-каталіцкага мітрапаліта. Архіепіскап Магілёўскі атрымаў сан мітрапаліта і меў звычайную рэзідэнцыю ў Пецярбургу. Гэты дэпартамент неўзабаве быў пераўтвораны ў спецыяльную рыма-каталіцкую калегію, якая зрабілася вышэйшым органам кіравання каталіцкай царквой у Расіі і была для яе такім жа органам царкоўнай улады, як Св. Сінод для праваслаўнай царквы. Калегія была прызнана і Ватыканам.

Падчас паўстання 1830–1831 гг. значная колькасць каталіцкіх святароў брала ўдзел у барацьбе на баку паўстанцаў. Урад Расіі звяртаў увагу Папы на тое, што становішча каталіцкай царквы ў дзяржаве ў значнай ступені будзе залежыць ад далейшых паводзін духавенства. Рускі пасол у Рыме скардзіўся Папскай курыі, што "духовенство разных ступеней, забывшее святость своей миссии, принимало участие в кровавых действиях и почти повсеместно стояло во главе революционных бунтов" [61]. У выніку перамоў папа Рыгор XVI, імкнучыся паслабіць ганенні на католікаў Беларусі і Польшчы, выдаў 9 ліпеня 1832 г. булу "Кум примум" са зваротам да епіскапаў рашуча выступіць супраць рэвалюцыянераў і заклікаць да падпарадкавання дзяржаўнай уладзе, дадзенай Богам. Але гэта не пазбавіла каталіцкую царкву ад рэпрэсій пасля паражэння паўстання. У 1832 г. быў закрыты 191 з 304 кляштароў з пераўтварэннем іх у прыходскія касцёлы. Мясцовыя ўлады ў гэты час не адважваліся закрыць Бялыніцкі касцёл, дзе штодзённа праводзіліся тры службы і знаходзіўся абраз цудатворнай Маці Божай, пакланіцца якой з'язджаліся вернікі з усёй Беларусі і нават Польшчы. Аднак хутка і ён быў закрыты. Такія "меры бяспекі" праводзіліся паступова, каб не дапусціць масавых хваляванняў насельніцтва. Былі закрыты кляштары і касцёлы: Чавускі, Радамысльскі – карлеліцкага ордэна; Віцебскі, Полацкі, Слуцкі, Вялонскі – бернардзінскага ордэна; Шклоўскі, Княжацкі, Галоўчынскі, Крычаўскі, Пацкаўскі, Малацічкі, Астраўлянскі, Дудакоўскі, Быніцкі – дамініканскага ордэна; Лукомльскі, Губінскі, Полацкі, Сакольнікаўскі – францысканскага ордэна; Аршанскі, Віцебскі, Бабінавіцкі – трынітарскага ордэна і г.д. [62]. Ксяндзы і сябры каталіцкіх кансісторый павінны былі прызначацца па ўзгадненні з губернатарамі.

Каталіцкім святарам забаранялася без спецыяльнага дазволу адлучацца з прыходу. Некаторыя кляштары зачыняліся ўвогуле, а іх зямельныя ўладанії былі канфіскаваны (толькі ў адным 1830 г. – 30). У Вільні быў выдадзены каталіцкі катэхізіс на рускай мове. У 1841 г. былі забраны ў казну зямельныя ўладанні касцёлаў і кляштароў рыма-каталіцкай царквы на той падставе, што яны былі населены выключна жыхарамі праваслаўнага веравызнання.

У 1841 г. за кошт казны ўтрымоўваліся 50 штатных кляштароў і часова пакінутых 57 няштатных.Усё духавенства павінна было атрымліваць жалаванне з казны. Замест Віленскага універсітэта з яго багаслоўскім факультэтам была заснавана рыма-каталіцкая семінарыя, пераведзеная ў 1842 г. у Пецярбург і пастаўленая пад нагляд рыма-каталіцкай калегіі. Выкладанне дазвалялася толькі на лацінскай або рускай мовах.

Крыху пазней, у 1847 годзе, Мікалай I заключыў канкардат з Рымскай Папскай курыяй, на падставе якога католікі атрымлівалі права на развіццё свайго рэлігійнага жыцця. Была заснавана Херсонская (потым перайменаваная ў Ціраспальскую) рыма-каталіцкая епархія. Але ўціск на каталіцкую царкву не спыніўся. Указам ад 1850 г. урад закрыў яшчэ 21 штатны кляштар і некаторыя няштатныя. У 1851 г. быў выдадзены ўказ, згодна з якім каталіцкаму духавенству дазвалялася чытаць толькі тыя пропаведзі, якія былі надрукаваны ў зборніках і прайшлі цэнзуру. Па словах мітрапаліта Іосіфа, першапачаткова "у императора Николая I была даже мысль присоединить къ православію латінян въ России таким же путем, какъ уніатов, кроме латінян, живущих в Привисленском крае" [63].

Такім чынам, у палітыцы царызму ў адносінах да каталіцкай царквы ў першай палове XIX ст. можна выдзеліць два перыяды. Першы – ад далучэння (1772) да 20-х гг. XIX ст. Другі – пачатак 20-х – 50-я гг. XIX ст. Калі ў першым галоўныя намаганні былі накіраваны на падпарадкаванне каталіцкага касцёла адзінаму дзяржаўнаму кіраванню, то другі быў звязаны з больш жорсткім курсам урада, галоўным зместам якога было абмежаванне ўплыву каталіцкага касцёла. У выніку эканамічны і палітычны ўплыў касцёла на мясцовае насельніцтва рэзка зменшыўся, а варожасць Ватыкана да ўрада Расії яшчэ больш узрасла. Выкарыстаўшы каранацыю Аляксандра II у 1856 г., Папа накіраваў у Маскву асобага пасланніка з лістом да імператара. Папа скардзіўся на скарачэнне



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

колькасці манастыроў, закрыццё вучылішч пры іх, прапанаваў прызначыць асобага нунцыя пры рускім двары. Аднак гэтыя скаргі і прапановы засталіся без увагі, тым больш што падчас паўстання 1863–1864 гг. рымская курыя падтрымлівала паўстанцаў. Папа тайна накіраваў у Польшчу і на Беларусь сакрэтную булу, якая вызваляла католікаў ад прысягі цару. У Рыме знаходзіўся паверацы па справах польскага паўстанцкага ўрада. У 1863 г. рымскі прастол прадпісаў здзяйсняць урачыстыя малебны за Польшчу ва ўсіх каталіцкіх краінах [64].

Каталіцкае духавенства, выкарыстаўшы свой уплыў на насельніцтва, падтрымлівала паўстанне. Так, прафесар Санкт-Пецярбургскай рымакаталіцкай духоўнай акадэміі ксёндз Фелінскі (потым архіепіскап Варшаўскі) сцвярджаў: "...Что касается до заговоров, то ни дозволять этого нельзя, ни запрещать совершенно на исповеди, но мы должны напомнить и предостеречь кающегося, чтобы не участвовал. Если же окажется, что в его действия не входит никакой личный расчет, что он делает это для общего, по его мнению, блага, то совершенно ему отказать в разрешении не можем" [65].

Пасля таго як паўстанне было задушана, пракацілася хваля арыштаў, ссылак. Сярод рэпрэсіраваных былі і многія каталіцкія святары. За спачуванне паўстанцам былі высланы і епіскап Адам Красінскі (Вільна), і епіскап Вайткевіч (Мінск). У 1867 г. рускі ўрад разарваў канкардат з Папскай курыяй, скасаваў Камянецкую епархію, закрыў духоўную акадэмію ў Пецярбургу і Падляскую епархію. Былі закрыты шмат касцёлаў і больш за 30 кляштароў [56]. Так, у Магілёўскай губерні не засталося ніводнага манастыра. У Віцебску з 1863 па 1881 г. колькасць каталіцкага духавенства зменшылася больш чым у 9 разоў (было 47, засталося 5). Увогуле да канца XIX ст. у беларускіх губернях было толькі 2 мужчынскія каталіцкія манастыры з 5 манахамі і 3 жаночыя з 55 манашкамі. Агульная колькасць касцёлаў і капліц складала 466, колькасць святароў – 505 [66].

Усе справы па кіраўніцтву рыма-каталіцкай царквой з гэтага часу былі падпарадкаваны дзяржаўным уладам і законам імперыі. У канцы 60-х гг. малітвы за "власть придержащую" здзяйсняліся не на польскай, а на рускай мове. Міністр народнай асветы і обер-пракурор Св. Сінода Д.А. Талстой распарадзіўся перавесці на рускую мову малітоўнікі, нядзельныя і святочныя евангеллі, катэхізіс і іншыя кнігі духоўнага зместу [67].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гэтыя захады ўлад сустрэлі супрацьдзеянне з боку каталіцкага духавенства і простых вернікаў. За непадпарадкаванне былі сасланы епіскапы Бароўскі, Берасневіч, Грынявіцкі і інш. Былі і ксяндзы, якія прынялі богаслужэбныя кніжкі на рускай мове і карысталіся імі. Увогуле спроба ўвесці рускую мову ў касцёлах на Беларусі поспеху не мела [68].

У 1883 г. Папа Леў XIII аднавіў канкардат з расійскім урадам па некаторых пытаннях. Абавязкі па кіраўніцтве скасаванай Мінскай епархіі ўскладаліся на Магілёўскага архіепіскапа-мітрапаліта. Рым прызнаў кантроль улад за выкладаннем рускай мовы, славеснасці і гісторыі ў каталіцкіх семінарыях і духоўнай акадэміі [69].

Прызначаныя па пагадненні 1883 г. каталіцкія епіскапы не заўсёды задавальнялі расійскія ўлады. Некаторыя з іх падтрымлівалі варожыя настроі да Расіі і праваслаўнай царквы і працягвалі лічыць Беларусь краем адабраным, падтрымлівалі мары аб адраджэнні Рэчы Паспалітай і уніяцкай царквы. У такіх выпадках улады дзейнічалі даволі рашуча і часта высылалі такіх святароў. За імі быў усталяваны жорсткі кантроль. За вывучэнне польскай мовы ў тайных польскіх школах з 1892 г. яны падлягалі грашоваму штрафу або арышту да трох месяцаў [70].

Падчас праўлення Мікалая II найбольш значнай падзеяй для каталіцкай царквы стала прыняцце ў красавіку 1905 г. указа аб верацярпімасці. Пасля гэтага ўказа дзейнасць каталіцкай царквы значна ажывілася. У канцы XIX – пачатку XX ст. у Расійскай імперыі (акрамя Царства Польскага) было 5 каталіцкіх епархій: Віленская, Цяльшэўская, Магілёўская – на землях Паўночна-Заходняга краю, а таксама Луцка-Жытомірская і Цірaспальская. На чале кожнай епархіі быў епіскап, а на чале Магілёўскай – архіепіскап з тытулам мітрапаліта рыма-каталіцкай царквы ўсёй імперыі. У кожнай епархіі дзейнічала духоўная кансісторыя. Акрамя таго, пры епіскапе састаяў капітул – сход некалькіх найбольш паважаных святароў епархіі, меўшых ганаровыя званні прэлатаў і канонікаў. У выпадку смерці епіскапа капітул павінен быў прызначыць са свайго складу ці з іншага духавенства часовага кіраўніка епархіі. У некаторых епархіях епіскапы мелі памочнікаў – епіскапаў-суфраганаў (былі ва ўсіх Паўночна-Заходніх епархіях).

Епархіі падзяляліся на дэканаты. Колькасць каталіцкіх прыходаў у Расійскай імперыі (з Царствам Польскім) была каля 2 700. У мнагалюдных прыходах акрамя настаяцеля быў адзін ці некалькі вікарных святароў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Каталіцкае духавенства атрымлівала ад казны пэўнае штатнае ўтрыманне. Акрамя гэтага, прыходы валодалі зямельнымі надзеламі. Былі і асобыя капіталы для пенсій, будаўніцтва і г.д.

Справамі ўсёй рымска-каталіцкай царквы імперыі кіравала рымска-каталіцкая калегія, якая знаходзілася ў Санкт-Пецярбургу. Старшынёй яе быў Магілёўскі архіепіскап-мітрапаліт. У склад калегіі ўваходзілі 14 духоўных асоб, зацверджаных урадам. З Папам расійскі ўрад падтрымліваў адносіны праз мітрапаліта-рэзідэнта, які жыў у Рыме.

У кожнай каталіцкай епархіі былі семінарыі, а ў сталіцы – духоўная акадэмія. У семінарыях вывучалі багаслоўскія прадметы, а таксама рускую мову, славеснасць і гісторыю.

Колькасць католікаў у Паўночна-Заходнім краі была значнай і ў канцы XIX ст. Так, у Віленскай губерні іх было 759 091, у Ковенскай – 41 315, у Віцебскай – 320 151. Усяго ў сярэдзіне 90-х гг. XIX ст. у Паўночна-Заходнім краі жыло 2 883 610 католікаў. На гэтай тэрыторыі дзейнічалі 597 касцёлаў, 8 кляштароў (3 – мужчынскія і 5 – жаночых). Колькасць каталіцкага духавенства складала 1 109 чалавек. У семінарыях навучалася 295 чалавек, у духоўнай акадэміі – 23 [71].

Магілёўскімі архіепіскапамі-мітрапалітамі ў XIX ст. былі Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч, Гаспар Цецішэўскі, Ігнацы Паўлоўскі, Казімір Дмахоўскі, Ігнацы Галавінскі, Вецэслаў Жылінскі, Антоні Фіалкоўскі, Аляксандр Гінтаўт, Сімон-Марцін Казлоўскі.

## ПРАТЭСТАНТЫЗМ

Пратэстантызм – адзін з трох галоўных напрамкаў хрысціянства, які складаецца з сукупнасці шматлікіх і самастойных цэркваў, сект, звязаных сваім паходжаннем з Рэфармацыяй. Пратэстантызм прытрымліваецца агульнахрысціянскіх уяўленняў аб быцці Бога, яго трыадзінстве, аб бессмяротнасці душы, раі і пекле (абвяргае каталіцкае чысцілішча) і г.д. Разам з тым пратэстанты вылучылі тры новыя прынцыпы: выратаванне асабістай верай, свяшчэнства ўсіх вернікаў, выключны аўтарытэт Біблії.

Першапачатковымі напрамкамі пратэстантызму былі: лютэранства, цвінгліянства, кальвінізм, трынітарызм, сацыянства, анабаптызм, менанітства і англіканства. У далейшым узнік шэраг плыняў, вядомых як "позні пратэстантызм": баптысты, метадысты, квакеры, адвентысты, мармоны, пяцідзесятнікі і г.д.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На далучаных да Расійскай імперыі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай беларускіх землях жылі вернікі розных пратэстанцкіх плыняў, галоўным чынам рэфарматы і лютэране.

Рэфарматы – прыхільнікі кальвінісцкай царквы. Іх вучэнне грунтуецца на Бібліі і працах Ж. Кальвіна. Богаслужэнне ў рэфарматаў зведзена да пропаведзі, чытання Бібліі і спеваў псалмоў. Асобныя абшчыны рэфарматаў абіралі на пэўны тэрмін пастараў і прэсвітэраў (старэйшын). Служыцелі культу некалькіх абшчын складалі прэсвітэрыі, якія ўваходзілі ў правінцыяльныя і нацыянальныя сіноды. На тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў галоўным духоўным кіраўніком над пратэстантамі быў сеньёр. Ён меў даволі шырокія паўнамоцтвы: прызначаў пастыраў, сачыў за паводзінамі духавенства, рэвізаваў зборы. Дапамагаў сеньёру памочнік, якога звалі кансеньёр. Кіраваў усімі справамі Віленскі евангеліка-рэфармацыйны сінод. Акрамя Вільні сіноды праводзіліся ў Слуцку, Расне, Капылі, Кайданаве, Беліцы і інш. Амаль усё справаводства вялося на польскай мове.

Лютэранства заснавана на прынцыпе апраўдання верай. Яно адмаўляецца ад духавенства як пасрэдніка паміж Богам і чалавекам. Лютэране лічаць, што выратоўвае толькі асабістая вера ў Бога, а не справы на карысць царквы. Крыніца веравызнання ў лютэран – Біблія. Культ адпавядае патрабаванню таннай царквы, але крыху больш урачысты, чым у кальвіністаў. Богаслужэнне адбываецца на нацыянальных мовах. Евангеліка-лютэранская царква падпарадкоўвалася Віленскай евангеліка-лютэранскай калегіі.

Сярод беларусаў – жыхароў края была распаўсюджана ў большай ступені евангеліка-рэфармацыйная плынь пратэстантызму. Сярод іншаземнага насельніцтва – евангеліка-лютэранская. Так, латышскае і нямецкае насельніцтва Віцебскай губерні спавядала галоўным чынам лютэранства.У 1848 г. на тэрыторыі губерні жыло 13 426 лютэран і рэфарматаў. Лютэранскія кірхі былі ў Віцебску, Полацку, Дынабургу, Люцыне і іншых гарадах і мястэчках (усяго 11 кірх). У канцы XIX ст., як сведчаць матэрыялы Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі, колькасць пратэстантаў у Віцебскай губерні не зменшылася, а нават узрасла амаль у 3,5 разы. Аднак трэба заўважыць, што адносна іншых хрысціянскіх канфесій пратэстанцкая была самай нешматлікай. Яе вернікі складалі толькі 3,15% усяго насельніцтва губерні [72].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На працягу XIX ст. пратэстанцкая царква паступова павялічвала колькасць вернікаў і рашуча выступала супраць умяшальніцтва ў яе справы прадстаўнікоў іншых канфесій. Так, у 1815 г. лютэранскі пастар Венцэль скардзіўся ў Пецярбург на уніяцкіх святароў, якія самавольна займаліся хрышчэннем, вянчаннем і пахаваннем лютэран. Другі дэпартамент рыма-каталіцкай калегіі (яму падпарадкоўвалася уніяцкая царква) праз полацкага уніяцкага епіскапа І. Красоўскага загадаў уніяцкаму духавенству не ўмешвацца ў справы іншых канфесій [73].

У другой палове XIX ст. у Беларусі з'явілася новая плынь пратэстантызму – баптызм. Пранікненне яго на тэрыторыю сучаснай Беларусі адбывалася рознымі шляхамі. Па-першае, некаторыя жыхары, асабліва бедныя сяляне, пакідалі родныя мясціны і ў пошуках заробку сяліліся ў Расіі і на Украіне, дзе і сустракаліся з абшчынамі евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Вярнуўшыся ў родны край, яны неслі веру землякам. Па-другое, у XIX ст. у цэнтральнай Польшчы, якая ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі, узнікла шмат баптысцкіх цэркваў. Аднак у сувязі з ціскам з боку мясцовых улад многія з евангельскіх хрысціян-баптыстаў выехалі ў Заходнюю Беларусь і на Украіну і там працягвалі сваю дзейнасць. Па-трэцяе, бедныя беларускія сем'і шукалі сродкаў для існавання і ў краінах Заходняй Еўропы, і ў Амерыцы і там прымалі новую веру. Пазней, у часы Першай сусветнай вайны, беларусы-бежанцы таксама часам далучаліся да баптыстаў. Напрыканцы XIX – пачатку XX ст. вялікую ролю ў распаўсюджванні веравучэння евангельскіх хрысціян-баптыстаў адыгралі кнігаНошы. Так, у Мінскай і Магілёўскай губернях кнігаНошам быў Ліпа Радзівонавіч Верасаў, на поўначы Беларусі – Іерэмія Міхайлаў і Марцін Лось. Вядомы імёны і некаторых іншых кнігаНош [74].

Распаўсюджванне веры евангельскіх хрысціян-баптыстаў сустрэла вялікія цяжкасці. Прыхільнікаў баптызму называлі сектантамі, раскольнікамі, выдавалі ўладам. І праваслаўныя, і каталіцкія святары выступалі супраць пашырэння дзейнасці евангельскіх хрысціян.

Як лічаць даследчыкі, першым месцам, дзе ўзнікла абшчына евангельскіх хрысціян-баптыстаў на Беларусі, была вёска Уць (сучасная Гомельская вобласць). Тут да 1905 г. быў пабудаваны і дзейнічаў добры малітоўны дом. Сярод першых былі абшчыны ў вёсцы Усохі Гомельскага уезду Магілёўскай губерні, Чачэрску, Віцебску, раёне Полацка. Чачэрскую абшчыну падтрымлівала княгіня Е.І. Чарткова, вядомая

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сярод пецярбургскіх вернікаў. У Чачэрску ў маёнтку яе бацькі адбываліся сходы баптыстаў. На іх запрашаліся не толькі сябры, але і прыслуга і просты люд. З цягам часу чачэрскую групу сталі падтрымліваць вернікі з Пецярбурга, якія дапамагалі матэрыяльна і духоўнай літаратурай (75). Дзейнічалі баптысцкія абшчыны і ў Мінскай, і ў Гродзенскай губернях.

У 1879 г. быў выдадзены цыркуляр Дзяржаўнага Савета аб духоўных справах баптыстаў. У ім, у прыватнасці, гаварылася:

"1. Баптисты на основании ст. 44 Основного государственного закона беспрепятственно исповедуют свое вероучение и исполняют обряды по существующим у них обычаям. Общественное богослужение они отправляют в устроенных или отведенных им для сего с разрешения губернатора домах.

2. Избираемые баптистами духовные наставники – старшины, учителя, проповедники могут совершать обряды и произносить проповеди не иначе, как после утверждения их в сем звании губернатором. Духовные наставники из иностранцев обязаны принести присягу на верность службе во время пребывания их в России.

3. Метрические записи браков, рождения и смерти баптистов ведутся местными гражданскими властями..." [76].

Трэці пункт дакумента меў для баптыстаў Расіі асобае значэнне. Справа ў тым, што шлюбы, нараджэнне дзіцяці, смерць і пахаванне вернікаў не прызнаваліся сапраўднымі. Дзеці лічыліся незаконнанароджанымі, права на спадчыну за імі не прызнавалася, хаваць на агульных могілках вернікаў-баптыстаў забаранялася.

Аднак на месцах не спяшаліся з выкананнем цыркуляра, патрабавалі тлумачэнняў. У 1882 г. першае тлумачэнне Міністэрства ўнутраных спраў падкрэслівала, што закон не распаўсюджваецца на рускіх баптыстаў, а тычыцца толькі замежных падданых, якія жывуць у Расіі і прынялі рускае падданства, з'яўляючыся баптыстамі. Далей у тлумачэнні гаварылася, што закон дзейнічае ў адносінах толькі да тых рускіх, якія перайшлі ў гэтую веру з неправаслаўнага веравызнання.

Такім чынам, у адносінах да пратэстанцкіх абшчын (у тым ліку штундыстаў, баптыстаў, пашкоўцаў), якія лічыліся сектамі, праводзілася неадназначная палітыка. З аднаго боку, дазвалялася пэўная свабода і некаторыя правы, з другога – жорсткія абмежаванні і шматлікія тлумачэнні, якія давалі магчымасць умешвацца ў справы царквы і свецкім,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і царкоўным (праваслаўным) уладам. Прыкладам можа служыць "Мнение Государственного Совета о даровании раскольникам всех вероисповеданий права на богослужения" (1883 г.). Артыкул 5 гэтага закона дазваляў "творить общественную молитву, исполнять духовные требы и совершать богослужения по их обрядам как в частных домах, равно и в особо предназначенных для сего зданиях, с тем... непременным условием, чтобы при этом не были нарушены общие правила благочестия и общественного порядка". Паводле артыкула 10, "уставщики, наставники и другие лица не подвергаются преследованию, за исключением тех случаев, когда они окажутся виновными в распространении своих заблуждений между православными или будут уличены в иных преступных деяниях" [77]. Але, нягледзячы на абмежаванні, евангельскія хрысціяне-баптысты ў другой палове XIX ст. здолелі правесці тры канферэнцыі і дзесяць з'ездаў (з 1879 па 1898 г.). Сама назва "евангельскія хрысціяне-баптысты" была прынята на з'ездзе ў Царыцыне ў 1903 г. і зацверджана ў 1905 г. на XIV з'ездзе ў Растове-на-Доне. У 1917 г. у Расіі было ўжо каля дзвюх тысяч абшчын з агульнай колькасцю вернікаў больш за 150 000 чалавек. У Віцебскай губерні ў канцы XIX ст. жыло 1 320 баптыстаў. Пры гэтым сярод гараджан колькасць іх была нязначнай – толькі 4 чалавекі [78].

## СТАРААБРАДНІЦТВА

У другой палове XVII ст. пасля анафемы раскольнікам на царкоўным саборы 1667 г. беглыя стараабрадцы пасяліліся на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Раскольнікі першапачаткова з'явіліся на ўкраінскіх старадубскіх землях. Потым цэнтрам раскольнікаў амаль на 70 год стала Ветка, якая ў момант свайго ўзнікнення знаходзілася на землях пана Халецкага. Вось як пра абставіны заснавання веткаўскай слабады пісаў А. Дамбавецкі: "С воцарением Иоана и Петра Алексеевича прислан был указ от соправительницы их царевны Софьи черниговскому архиерею и стародубскому полковнику, чтобы беглых людей, живущих в стародубских слободах, возвратить на место их родины и обращать к православию. Раскольники разбежались в разные стороны... перешли рубеж литовский и ... в 15 верстах, почти у самой русской границы,... на пустом острове реки Сожа и построили себе первую слободу, названную по имени острова Веткою" [79]. Ветка – збіральная назва, кожная з некалькіх яе слабод мела ўласную назву. Акрамя таго, вакол веткаўскай слабады даволі хутка з'явіліся шматлікія скіты і келлі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Расійскія ўлады неаднаразова рабілі захады, каб вярнуць раскольнікаў. Рабілі гэта імператрыца Елізавета, Петр III і двойчы Кацярына II (у 1762 і 1763 гг.). Пры гэтым у кацярынінскіх маніфестах абяцалася дараванне і дазвол сяліцца слабодамі не толькі ў Сібіры, але і ў Курскай, Варонежскай і Казанскай губернях. Кацярына II абяцала і вызваленне на 6 год ад подацей і рэкруцтва, а таксама магчымасць вярнуцца да сваіх паноў або запісацца ў дзяржаўныя сяляне ці купецтва. Захады расійскага ўрада засталіся безвыніковымі. Тады ў 1764 г. "у Польшчу" было накіравана войска генерала-маёра Маслава, каб прымусам вярнуць раскольнікаў. Адбылося так званае "другое выгнанне" стараабрадцаў. Каля 20 000 чалавек з Веткі былі пераселены (у тым ліку адпраўлены на пасяленне ў Сібір). Многія са стараабрадцаў уцяклі і рассяліліся ў розных мясцінах Магілёўскай губерні [80].

Праз некаторы час галоўным цэнтрам магілёўскіх раскольнікаў стаў горад Беліца ў Гомельскім уездзе і блізкія да яго слабоды Чарнігаўскай губерні. У Беліцы і населеных пунктах побач з ёй высіліся раскольніцкія капліцы са званамі і высокімі агароджамі. Было тут шмат манастыроў і скітаў, дзе беглыя папы і іераманахі здзяйснялі для стараабрадцаў маленні і царкоўныя патрэбы [81]. Некаторыя з раскольніцкіх манастыроў, цэркваў і скітаў з указаннем месца знаходжання і ўладальніка зямлі пералічыў у спецыяльнай ведамасці ад 1802 г. рэктар Магілёўскай духоўнай семінарыі архімандрыт Магілёўскага Богаяўленскага манастыра Іоасаф. Гэта: Лаўрэнцьеўскі манастыр, что знаходзіўся за 12 вёрст ад Гомеля, Іоасафаўскі манастыр – 20 вёрст ад Гомеля, скіт каля Агародні – 40 вёрст ад Гомеля, Пыханскі манастыр – 35 вёрст ад Гомеля, Тырлаўскі манастыр – 7 вёрст ад Гомеля, скіт Чыстыя лужы – 7 вёрст ад Гомеля. У гэтых стараабрадніцкіх абіцелях жыло больш за 300 раскольнікаў. Усе яны былі заснаваны ва ўладаннях графа Р.П. Румянцава. На землях іншых уладальнікаў названы жаночы манастыр пры Спасавай слабадзе, Веткаўскі манастыр, хутар Абрамаўка каля Веткі [82].

Стараабрадцы ўтварылі на беларускіх землях аднародную канфесійна адасобленую этнічную групу і былі да 1763 г. у пераважнай большасці сярод рускага насельніцтва Беларусі. Агульная колькасць іх у пачатку 60-х гг. XIX ст. складала звыш 34 000 чалавек – каля 1,1% усяго насельніцтва Беларусі. Найбольш шматлікія групы стараабрадцаў у сярэдзіне XIX ст. пражывалі ў Гомельскім (звыш 11% насельніцтва), Віцебскім (6,6%), Полацкім (5,8%), Сеннінскім (2,9%), Дзісенскім (2,3%), Бабруйскім (1,4%) паветах. Каля 28% стараабрадцаў жылі ў гарадах [83].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сярод беларускіх стараабрадцаў былі прадстаўнікі абодвух асноўных напрамкаў стараабрадніцтва – як папоўшчыны, так і беспапоўшчыны. Папоўскія абшчыны захавалі папоў і ўсе духоўныя чыны. Зыходзячы з тэзісу "без священства нет христианства", яны пачалі прымаць да сябе святароў панаваўшай царквы. Таму кажуць, што папоўцы сталі "беглапапоўцамі". Беспапоўцы абралі іншы шлях і ўвогуле адмовіліся ад усялякіх сувязей з афіцыйнай праваслаўнай царквой, сцвярджаючы, што: "с ересью Никона благодать отлетела на небо, русская церковь потеряла апостольскую власть; попы господствующей церкви не попы, а волки, всякое общение с ними – смертный грех; восточные патриархи – участники ереси; пало все православие, не может быть законного священства" [84]. Беспапоўцы адмаўлялі не толькі царкоўную іерархію, але і галоўныя хрысціянскія таінствы, у тым ліку і шлюб.

І папоўства, і беспапоўства не былі аднароднымі, яны складаліся з розных толкаў і сект. У Віцебскай губерні ў асноўным жылі беспапоўцы. З мноства толкаў тут былі найбольш пашыраны федасееўскі, філімонаўскі і паморскі. Усяго у Віцебскай губерні было 37697 стараабрадцаў [85]. Стараабрадцы Магілёўскай губерні ў большасці належылі да папоўцаў (ці беглапапоўцаў). Яны былі аб'яднаны ў веткаўскі, епіфаніеўскі, дыяканаўскі толкі. Жылі ў Магілёўскай губерні і беспапоўцы філіпаўскага толку.

Падзел стараабрадніцтва на мноства толкаў тлумачыўся не толькі тэрытарыяльнай раз'яднанасцю, адсутнасцю адзінага арганізацыйнага цэнтра, абавязковай для вернікаў дагматыкі, але і сацыяльнай неаднароднасцю стараабрадніцкага руху, якая была ўласціва яму ўвесь час. "Отказ от новых обрядов стал лишь флагом, под которым выступал кто угодно. И фанатик-изувер. И мужик, стремящийся к освобождению от идущего рука об руку с полицейским урядником попа. И народный мыслитель, мечтающий об осуществлении идеалов христианства, но не находящий их в государственной церкви. Богатый купец, что выше церковного старосты в синодской церкви не пойдет, а здесь может и "свою веру" основать, и своего епископа поставить, и как брат во Христе со всеми удобствами эксплуатировать своих единоверцев… И даже – ближе к нашим дням – наследник славянофилов, философ-математик, мечтающий восстановить через старообрядчество связь интеллигенции с народом. Вот почему " расколу" сочувствовали люди совершенно разные" [86].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Веткаўскае "согласие", ці веткаўшчына, мела прыхільнікаў не толькі на беларускіх землях. Стараабрадцы гэтага толку папоўшчыны жылі і ў Старадуб'і, і на Доне, і ў Ніжагародскай губерні, і ў Маскве, і ў іншых мясцінах Расійскай імперыі. Веткаўшчына адрознівалася ад іншых толкаў тым, што мірапамазанне пры хрышчэнні дзяцей і дарослых, а таксама тых, хто перайшоў да іх з праваслаўя, здзяйснялася ўласным мірам. Другое адрозненне было ў тым, што і святароў, і міран, якія перайшлі да іх з праваслаўя, перахрышчвалі без апускання ў ваду. Былі і некаторыя іншыя асаблівасці. Вось як пра іх пісаў А. Дамбавецкі: "...ветковцы а) принимают иконы, писанные и не единоверными с ними художниками; б) сообщаются в пище и питии с православными... и не считают грехом ходить вместе с ними в баню; в) попы их, во время отсутствия своего, избирают мирян и предоставляют им право принимать переходящих в их веру... исповедовать...; г) венчают в избах и клетях; д) запасные дары евхаристии дают монахам и мирянам... которые не только себя причащают этими дарами, но причащают и других" [87].

Стараабрадцы вялі даволі замкнёны лад жыцця. Большасць з іх належыла да сялян і гарадскіх нізоў. Галоўнымі заняткамі былі земляробства, рамяство і гандаль. Былі сярод стараабрадцаў і прадстаўнікі буржуазіі (вядомыя рускія прадпрымальнікі Марозавы, Рабушынскія, Гучковы, напрыклад, былі стараабрадцамі). Увогуле кансерватызм у пытаннях рэлігійных не перашкаджаў стараабрадцам займацца справамі, якія забяспечвалі матэрыяльны дабрабыт. Эканамічныя поспехі пры гэтым разглядаліся як перамога ідэй старай веры, як справа богаўгодная. Даследчыкі адзначаюць таксама ўласцівыя стараабрадцам узаемадапамогу, беражлівасць, працавітасць і дзелавітасць. Сярод стараабрадцаў Магілёўскай губерні былі багатыя купцы, якія вялі гандаль на сотні тысяч рублёў, буйныя гандляры коньмі і іншай жывёлай. Гандаль хлебам, соллю і лесам на вялікія сумы вёўся галоўным чынам веткаўскімі купцамі. Дробныя гандляры прадавалі салёную і свежую рыбу, свечкі, алей, а таксама экіпажы, сані і г.д. Займаліся стараверы і featuresознымі рамёствамі і промысламі. А. Дамбавецкі ў "Вопыце апісання Магілёўскай губерні" згадвае: "Среди старообрядцев... судовщики, лоцманы, извозчики, плотники, каменщики, красильщики и другие ремесленники..." Значная частка старабрадцаў Магілёўскай губерні займалася земляробствам. Агародніцтвам займаліся не толькі на ўласных агародах, але і на арэндаваных землях. Часам агародніцтва і арэнда фруктовых садоў давалі да 300 рублёў гадавога прыбытку [88].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Ідэолагі і іерархі старaабрадцаў прапаведавалі ідэю пабудовы рускага міру на рускіх пачатках, роўнасці, арцельнага і абшчыннага ўпарадкавання, свабоды пераходу і навучання, выбарнага духавенства і г.д. Аднак патрабаванні гэтыя не мелі рэвалюцыйнага характару і былі агульнадэмакратычнай накіраванасці. Зразумелымі ў сувязі з гэтым з'яўляюцца адмоўныя адносіны старaабрадцаў да заклікаў рэвалюцыянераўдэмакратаў (Герцын і Агароў выдавалі для іх спецыяльны часопіс "Общее дело") і асуджэнне ўдзельнікаў польскіх паўстанняў і рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе. Мітрапаліт Кірыл у спецыяльным пасланні пісаў: "Всякое благоразумие и покорение покажите перед царем вашим и от врагов его удаляйтесь и бегайте, яко же от мятежных поляков, так наипаче от злокозненных безбожников, гнездящихся в Лондоне..." [89].

На працягу ўсяго XIX ст. абсалютная колькасць старaабрадцаў на беларускіх землях павялічвалася. Аднак адносная колькасць іх сярод насельніцтва заставалася амаль нязменнай: 1,1% – у 1863 г., 0,98% – у 1897 г. і 1,1% – у 1913 г. [12]. У Магілёўскай губерні афіцыйны і штогодні падлік старaабрадцаў пачаўся ў адпаведнасці з імператарскім загадам ад 3 мая 1839 г. У 1847 г. на гэтых землях жыло 14 678 старaабрадцаў (14 349 – папоўцы, 329 – беспапоўцы). Да канца XIX ст. лічба ўзрасла да 28 000, з іх 21 000 старaабрадцаў жыла ў Гомельскім уездзе, астатнія галоўным чынам – у Сенненскім і Рагачоўскім. Каля 9 000 належылі да белакрыніцкага толку, каля 9 000 – да беглапапоўцаў і астатнія 9 000 – да беспапоўцаў [90].

Увесь час, асабліва да падзелаў Рэчы Паспалітай, мелі месца і выпадкі пераходу ў "раскол" праваслаўных вернікаў. Гэта вымусіла ўрад у 1797 г. афіцыйна забараніць такі пераход, пра што былі папярэджаны міністрам унутраных спраў усе беларускія губернатары. Даследчыкі адзначаюць асаблівасці пераходу ў старaабрадніцтва на беларускіх землях. Сярод галоўных – спачуванне старaабрадцам з боку католікаў і уніятаў, якія разглядалі праваслаўную царкву як крыўдзіцеля, а таксама тое, што збяднелыя гараджане і беглыя сяляне шукалі дапамогі ў багатых старaабрадцаў, якія атрымлівалі танную рабочую сілу і хавалі ўцекачоў. Неабходнасць матэрыяльнай падтрымкі, узаемадапамогі і аднадумства тлумачылася тым, што ў Магілёўскай губерні старaабрадцы не мелі глыбокіх каранёў [91].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Царскі ўрад і праваслаўная царква пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ўвесь час імкнуліся " если не к совершенному уничтожению, то по крайней мере к уменьшению как религиозного их значения, так и политической важности главнейших и могущественнейших их толков" [92]. Пры гэтым меліся на ўвазе і сувязі з замежнымі раскольнікамі, і тая акалічнасць, што стараабрадцы кантралявалі вялікія прыватныя і грамадскія капіталы. Непакоіла ўлады і тое, што названыя вышэй магчымасці стараабрадцы выкарыстоўвалі, каб захаваць такое становішча, пры якім "в гражданском отношении... они составляют особые общества, желающие преобресть свою особую самобытность и сопротивляющиеся общим постановлениям государства, общества, которые при малейших внутренних беспорядках или распрях с соседними державами могут иметь большое влияние на государство..." [93].

У канцы XVIII – першай палове XIX ст. урадам было выдадзена шмат пастаноў аб раскольніках. Ужо вялася размова пра забарону пераходу з праваслаўя ў "раскол" у 1797 г. 12 жніўня 1805 г. быў выдадзены загад аб увядзенні метрычных кніг у стараабрадніцкіх паселішчах. 17 лютага 1812 г. – аб дазволе мець святароў, толькі выбраных епархіяльнымі архірэямі. У 1829 г. выйшла распараджэнне "Аб забеспячэнні губернатараў выпіскамі з высачайша зацверджаных пастаноў аб раскольніках". Пастановай 1830 г. забараняўся ўезд у дзяржаву замежных стараабрадцаў. Акрамя таго, 5-ы пункт гэтай пастановы прадугледжваў адкрыццё сакрэтных дарадчых камітэтаў па справах раскольнікаў ва ўсіх губернскіх гарадах. У склад камітэтаў павінны былі ўвайсці епархіяльныя архірэі, губернатары, старшыні палаты дзяржаўных маёмасцей і жандармскія штаб-афіцэры. Ёсць звесткі і пра тое, што 18 красавіка 1847 г. у Магілёве генерал-губернатар прымаў удзел у "направлении сего комитета" [94].

У сярэдзіне XIX ст. быў утвораны асобы камітэт для перагляду пастаноў аб раскольніках. Адным з вынікаў яго работы стала выдадзеная III аддзяленнем Дэпартамента МУС 15 кастрычніка 1858 г. сакрэтная "Пастанова для дзеянняў з раскольнікамі". Яна, у прыватнасці, прапанавала:

§ 1. ...в делах раскола гражданское начальство действует единодушно с духовным и взаимно стремится к... искоренению в народе раскольнических побуждений...

§ 2. ...коренное правило, по которому состоящие в расколе от рождения... не преследуются... но им строго воспрещается распространять



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

свои заблуждения между православными и вообще уклоняться от исполнения общих, законом определенных, правил благоустройства...

§ 6. Домогательства раскольников о дозволении им вступать в брак, окрестить младенца или похоронить умерших по их обрядам оставлять без всякого действия.

§ 7. Гражданское начальство имеет самое строгое наблюдение за недопущением... из заграницы раскольницких лжеепископов и лжепопов.

§ 8. ...чтобы раскольники не заводили скитов или иных сего рода обиталищ, и также не строили новых своих молитвенных зданий..." [95].

Па закону 1864 г. усе раскольнікі былі падзелены на "больш шкодныя" (не прызнавалі шлюб, не маліліся за цара і г.д.), "шкодныя" (усе астатнія беспапоўцы) і " менш шкодныя" (папоўцы). У Магілёўскай губерні большую частку стараабрадцаў складалі "менш шкодныя". Іх было ў 1874 г. 14 349 чалавек. Большасць "менш шкодных" стараабрадцаў жыла ў Беліцкім павеце (120 134), а "шкодных" – у Рагачоўскім (318) [96].

Энергічна змагаліся з "расколам" амаль усе магілёўскія епіскапы. Сярод іх быў і епіскап Анастасій (Братаноўскі), які ўзначаліў Магілёўскую епархію ў 1797 г. Гэта быў "...иерарх отменных дарований нравственных доблестей..." [97], які шмат зрабіў для ўзвышэння праваслаўя. Яго характарызуюць як арыгінальнага прапаведніка, жывога і свабоднага, красамоўнага аратара. Ёсць і сведчанні "особого благоволения" да яго Кацярыны II, якая лічыла, што "...Анастасию или должно подражать или превзойти его, но и то и другое – равно невозможно" [98].

Пры архіепіскапе Анастасіі ў Магілёўскай епархіі было шмат раскольніцкіх паселішчаў і манастыроў, асабліва ў Гомельскім уездзе. Уладыка быў добра знаёмы са стараабрадніцкім пытаннем. Яшчэ ў 1797 г. (ён быў тады Новаспаскім архімандрытам і членам Св. Сінода) Анастасій склаў па даручэнні Наўгародскага мітрапаліта Гаўрыіла "Рассуждение о раскольниках российской церкви". Праз год, ужо з'яўляючыся епіскапам Магілёўскім, Анастасій прымае ўдзел у вырашэнні пытання аб веткаўскіх раскольніках, якія адбілі беглага папа, арыштаванага земскім суддзёй. Стараабрадцы звярнуліся за заступніцтвам да Анастасія. Епіскап хадайнічаў перад губернатарам С. Жагуліным, і веткаўцы пазбеглі пакарання. 16 снежня 1798 г. быў выдадзены і ўказ Св. Сінода з сакрэтным дазволам "ветковским старообрядцам иметь у себя церковь

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

и священников..." [99]. Справа гэта, аднак, завяршылася вымовай епіскапу Анастасію, якую ён атрымаў па ўказу Паўла І ад 21 лістапада 1798 г. Прычынай вымовы стала адмаўленне веткаўцаў ад абяцання далучыцца да праваслаўнай царквы.

Епіскап Анастасій падтрымліваў умацаванне адзінаверскага руху на землях епархіі. Яшчэ ў 1784 г. быў выдадзены ўказ Кацярыны II на імя Наўгародскага мітрапаліта Гаўрыіла, " чтобы сообщил могилевскому и славянскому архиепископам о... дозволении им отправлять службу по их обрядам". Там жа ішла гаворка пра пабудову цэркваў для раскольнікаў і прызначэнне праваслаўных святароў для богаслужэння па старадрукарскіх кнігах. Цэрквы гэтыя атрымалі назву адзінаверскіх, а прыхаджане – адзінаверцаў [100]. Пры Анастасіі далучыўся да адзінаверскага руху Чонскі манастыр. У 1800 г. у манастыры жылі "иеромонах Иоасаф, Аврамий, Филипп, иеродиакон Боголеп, семь других монахов и три послушника. Жили братья несогласно: ссорились, дрались, потом мирились. Начальство должно было разбирать многочисленные дрязги, но это было нелегко. Старообрядческие обители привыкли жить по своим законам, общемонастырскому уставу подчиняться не хотели" [101]. У 1845 г. Чонскі манастыр быў далучаны да Мар'еўскага адзінаверскага манастыра. Увогуле ж справа пашырэння адзінаверства поспеху не мела. Чонскі манастыр заставаўся да 40-х гг. XIX ст. адзіным пунктам, дзе яно больш-менш трывала захоўвалася. У другіх мясцінах (Беліцы, Ветцы) мелі месца толькі спробы замацаваць адзінаверства. Так, у 1801 г. у Ветцы па ўказу Св. Сінода дазволілі пабудаваць царкву і прызначыць святаром не беглага папа Максімава, якога хацелі веткаўцы, а "...другого, способного и достойного к сему званию" [102]. Веткаўцы адмовіліся.

Неаднаразова наведваў стараабрадцаў Магілёўскай епархіі і епіскап Смарагд. Ён добра ведаў стараабрадніцкія манастыры, скіты, капліцы і прымаў меры для іх закрыцця ці ператварэння ў праваслаўныя. У выпадках асаблівага супрацьдзеяння раскольнікаў ён звяртаўся да грамадзянскіх улад як Магілёўскай, так і Чарнігаўскай губерняў. Па хадайніцтву Смарагда 16 лютага 1839 г. Св. Сінод упершыню прызначыў спецыяльных місіянераў для вяртання раскольнікаў, якія жылі ў Магілёўскай губерні, у праваслаўе [103]. Крыху пазней, у красавіку 1839 г., Смарагд патрабуе пераўтварыць Беліцкую стараабрадніцкую капліцу з яе ўбранствам і званамі ў цёплую царкву для праваслаўных. Загаду гэтаму

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

папярэднічалі наступныя падзеі. У 1837 г. чыноўнік асобых даручэнняў пры Магілёўскім губернатары Маркаў-Дзям'янкоў запячатаў Беліцкую капліцу. Пасля гэтага беліцкія раскольнікі пачалі збірацца ў доме мешчаніна Шведава і тут здзяйсняць свае маленні. У доме Шведава знайшлі дарахавальніцу, з дапамогай якой стараабрадцкі поп Гомельскай Спаскай слабады Васілі Ліхачоў прычашчаў раскольнікаў. У малельні Шведава былі адабраны абразы, 2 медныя крыжы і набажэнскія кнігі – Псалтыр і Часаслоў. Тады Смарагд і выдае сваё распараджэнне. Беліцкія стараабрадцы скардзіліся цару, але скарга іх засталася без увагі і адказу. А крымінальны суд Магілёўскай палаты прысудзіў галоўных віноўнікаў патаемных раскольніцкіх сходаў у Беліцы да арышту, а забраныя ў Шведава рэчы былі перададзены ў Троіцкую праваслаўную царкву ў Гомелі [104].

Трэба падкрэсліць, што ўвогуле скаргі раскольнікаў на грамадзянскія ўлады і царкоўных іерархаў часцей за ўсё заставаліся без адказу. У 1839 г. была зачынена капліца і пакараны ўдзельнікі сходаў у Мар'інай слабадзе Беліцкага павета. Мар'інскія раскольнікі скардзіліся цару. І вось што атрымалі ў адказ. Паводле даклада міністра ўнутраных спраў імператар Мікалай I 16 мая 1842 г. загадаў: "означенную (Марьинскую) запечатанную за противозаконные поправки часовню вновь не открывать, а колокола снять и передать в православную церковь по усмотрению епархиального начальства" [105].

Епіскап Анатолій бачыў у расколе з'яву не толькі рэлігійнага характару, але і палітычнага. Ён лічыў, што стараабрадцы, прыкрываючыся рэлігійнымі матывамі, імкнуцца да незалежнасці ад грамадскіх законаў. "До тех пор пока раскольники не будут подчинены гражданским законам, всякое покушение привлечь их в недра св. церкви не только останется тщетным, но и даже более будет ожесточать их в противлении церкви, обольщая простейших из них мыслью, будто они преследуются за исповедание старой веры, а не за нарушение гражданских законов", – пісаў ён у рапартах Св. Сіноду [106].

У сваіх адносінах да стараабрадцаў епіскап Анатоль дзейнічаў мерамі духоўнымі: праводзіў гутаркі наконт веры ў час наведвання населеных пунктаў раскольнікаў; праводзіў літургіі ў праваслаўных храмах гэтых мясцін; складаў пастырскія пасланні для "Христианского чтения" і для асобных выданняў. Аднак епіскап не пазбягаў і мер паліцэйскага характару: закрываў капліцы, згаджаўся на арышты і прыцягненне



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

да суда раскольнікаў. Захады епіскапа Анатоля прынеслі пэўны плён. У Магілёўскай епархіі за час яго епіскапства амаль 1 000 стараабрадцаў далучыліся да праваслаўнай царквы [107]. Значна зменшылася да сярэдзіны XIX ст. і веткаўская стараабрадніцкая федэрацыя. У параўнанні з пачаткам XVIII ст. колькасць раскольнікаў скарацілася тут у тры разы. Для ажыццяўлення рытуальных мэтаў у іх было 8 манастыроў, 15 капліц і 4 малітоўныя дамы [108].

Трэба адзначыць, што пераадолець "раскол" ні цэнтральным, ні мясцовым уладам не ўдалося. У канцы 40-х гг. XIX ст. толькі ў Магілёўскай епархіі было 28 капліц стараабрадцаў, 18 з іх мелі прастолы і па сутнасці былі цэрквамі. Па перапісе 1897 г. толькі ў Віцебскай губерні жыло 40 603 мужчыны і 42 365 жанчын-стараабрадцаў (5,57% усяго насельніцтва губерні) [109].

Такім чынам, асноўныя рысы і тэндэнцыі канфесіянальнага жыцця Беларусі пасля далучэння да Расійскай імперыі вызначаліся не толькі і не столькі асаблівасцямі нацыянальнага складу насельніцтва, геаграфічным становішчам і г.д., колькі палітыкай царскага ўраду, якая была накіравана на русіфікацыю края і пашырэнне праваслаўя, памяншэнне ўплыву іншых канфесій. Аб поспехах гэтай палітыкі сведчаць і статыстычныя матэрыялы. Падчас далучэння да Расійскай імперыі на беларускіх землях (першы падзел) жыло 100 тысяч католікаў, 300 тысяч праваслаўных і 800 тысяч уніятаў [110]. У канцы XIX ст. становішча выглядала зусім інакш. Ва ўсім Паўночна-Заходнім краі было 4 680 193 праваслаўных, 2 973 008 католікаў, 1 515 642 іудзея, 147 838 раскольнікаў, 515 620 пратэстантаў, 14 253 мусульманіна [111]. Па перапісе 1897 г. з 1 686 764 жыхароў Магілёўскай губерні праваслаўныя складалі 1 402 161 чалавек, католікі – 50 159 чалавек, іудзеі – 203 946 чалавек, стараабрадцы – 23 349, лютэране – 6 800, рэфарматы – 30, баптысты – 2, менаніты – 1. Жылі ў губерні і армяне-грыгарыяне (6 чалавек), армяне-католікі – 16. Крыху іншым было размеркаванне насельніцтва па веравызнаннях у гарадах. У прыватнасці, у Магілёве з 43 119 чалавек насельніцтва 21 539 былі іудзеямі, 18 922 – праваслаўнымі, 2 279 – католікамі, 252 – лютэранамі, 3 – рэфарматамі, 6 – магаметанамі, 2 – армяна-католікамі, 8 – караімамі, 107 – стараабрадцамі [137]. У Віцебскай губерні праваслаўнае насельніцтва складала 55,44% ад усіх жыхароў губерні, каталіцкае – 23,99%, пратэстанты – 3,15%, магаметане – 0,04% [112].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СПАСЫЛКІ

1. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 135–136.

2. Полное собрание законов Российской империи. – СПб., 1830. – Т. XIX. – С. 688–689.

3. *Смяховіч М.* Узаемаадносіны самадзяржаўя з каталіцкай царквой на Беларусі (1772–1867 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 1. – С. 45.

4. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 160–161.

5. Гл.: Витебская старина / сост. и изд. А. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. I. – С. 534–540; Сборник документов, уясняющих отношение латино-польской пропаганды к русской вере и народности. – Вильна, 1866–1867. – С. 208; *Мартос А.* Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. – Буэнос-Айрес, 1966. Репринт. Белорусский Экзархат Русской Православной Церкви. – Мн., 1990. – С. 197, 237.

6. *Мартос А.* Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. – Буэнос-Айрес, 1966. Репринт. Белорусский Экзархат Русской Православной Церкви. – Мн., 1990. – С. 236.

7. Тамсама. – С. 236.

8. *Римский С.В.* Церковная реформа 60–70-х годов XIX века // Отечественная история. – 1995. – № 2. – С. 167.

9. Описание сельского духовенства // Русский заграничный сборник. – Berlin, Paris, London, 1858. – С. 25.

10. Могилевская епархия. Историко-статистическое описание. Т. 1. Выпуск 2. Часть 2. – Могилев, 1910. – С. 11–12.

11. Могилевские епархиальные ведомости. – 1889. – № 28. – С. 393–394.

12. Гл.: Витебская старина. – Т. I. – С. 535–540; *Мартос А.* Назв. твор. – С. 241; *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 216.

13. Могилевская епархия. Историко-статистическое описание. Т. 1. Выпуск 2. Часть 2. – Могилев, 1910. – С. 22.

14. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 216.

15. *Жудро Ф.* Свято-Духовский монастырь Могилевской епархии. – Могилев на Днепре. Скоропечатня и литография Ш. Фридмана, 1904. – С. 72–73.

16. Могилевская епархия. Историко-статистическое описание. Т. 1. Выпуск 2. Часть 2. – Могилев, 1910. – С. 24–29.

17. Описание сельского духовенства // Русский заграничный сборник. – Berlin, Paris, London, 1858. – С. 27.

18. Тамсама. – С. 158–160.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

19. *Римский С.В.* Церковная реформа 60–70-х годов XIX века // Отечественная история. – 1995. – № 2. – С. 170.
20. Тамсама. – С. 173.
21. Тамсама. – С. 173.
22. Могилевская епархия. Историко-статистическое описание. Т. 1. Выпуск 2. Часть 2. – Могилев, 1910. – С. 208.
23. Тамсама. – С. 238.
24. Тамсама. – С. 271.
25. Могилевские епархиальные ведомости. – 1889. – № 9–10. – С. 121.
26. Тамсама. – С. 70.
27. Тамсама. – С. 94.
28. Могилевские епархиальные ведомости. – 1889. – № 26–27. – С. 235.
29. Тамсама. – С. 228–232.
30. Тамсама. – С. 236–246.
31. Отчет о церковно-приходских школах Могилевской епархии за 1888–1889 учебный год. – Могилев, 1910. – С. 14–15.
32. Тамсама. – С. 22–23.
33. Могилевские епархиальные ведомости. – 1889. – № 25. – С. 340–342.
34. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 228–229.
35. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи. 1897. – Т. XXIII: Могилевская губерния / под. ред. Н.А.Тройницкого. – СПб., 1903. – С. 266–267; Т. V: Витебская губерния. Тетрадь I. С. 1; Тетрадь II. С. 88–89; Тетрадь III. С. XI.
36. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 222.
37. Витебская старина. Т. I. – С. 204–207.
38. Гл.: *Мартос А.* Назв. твор. – С. 220–221.; *Ільяшэвіч М.* Расійская палітыка на землях былога Беларуска-літоўскага гаспадарства за панавання Кацярыны II і Паўла I. – Вільня, 1933. – С. 18.
39. Витебская старина. Т. I. – С. 110.
40. *Де-Пуле М.* Станислав-Август Понятовский в Гродно и Литва в 1794–1797 годах. – изд. 2-е. – СПб., 1871. – С. 229–230.
41. *Сапунов А.* Исторические судьбы Полоцкой епархии с древнейших времен до половины XIX века. – Витебск, 1905. – С. 123–124.
42. *Киприанович Г.Я.* Жизнь Иосифа Семашки митрополита Литовского и Виленского и возсоединение западно-русских униатов с православной церковью в 1839 г. – Вильна, 1893. – С. 111.
43. *Мартос А.* Назв. твор. – С. 222.
44. *Киприанович Г.Я.* Жизнь Иосифа Семашки митрополита Литовского и Виленского и возсоединение западно-русских униатов с православной церковью в 1839 г. – Вильна, 1893. – С. 130.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

45. *Грыгор'ева В., Філатава А.* З гісторыі канфесіянальнага жыцця Віцебскай губерні (канец XVIII – пачатак XIX стст.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 2. – С. 18.

46. *Мартос А.* Назв. твор. С. 225–226.

47. Гл.: *Грыгор'ева В., Навіцкі У., Філатава А.* Уніяцтва на Беларусі ад Полацкага сабора 1839 года да нашых дзён // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 2. – С. 47; Витебская старина. Т. I. – С. 445.

48. Записки Василия Лужинского архиепископа Полоцкого. – Казань, 1885. – С. 235–236.

49. *Грыгор'ева В., Навіцкі У., Філатава А.* Назв. твор. – С. 48–49.

50. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 182–183.

51. Тамсама. – С. 209–210.

52. Гл.: Витебская старина. Т. I. – С. 438–435; *Грыгор'ева В., Навіцкі У., Філатава А.* Назв. твор. – С. 49.

53. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1985. – С. 184.

54. *Мартос А.* Назв. твор. – С. 225–226.

55. *Мараш Я.Н.* Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795 гг.). – Мн., 1971. – С. 105.

56. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 137.

57. Тамсама. – С. 139.

58. *Де-Пуле М.* Назв. твор. – С. 220.

59. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1985. – С. 142.

60. Гл.: *Грыгор'ева В., Філатава А.* Назв. твор. – С. 49; *Киприанович Г.Я.* Назв. твор. – С. 144.

61. *Мартос А.* Назв. твор. – С. 246.

62. *Смяховіч М.* Назв. твор. – С. 48.

63. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 148.

64. Тамсама. – С. 151.

65. Тамсама. – С. 150.

66. Гл.: Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.). – Мн., 1998. – С. 68; Витебская старина. Т. I. – С. 445, 452; *Смяховіч М.* Назв. твор. – С. 49.; *Мартос А.* Назв. твор. – С. 247–248.

67. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 151–152.

68. *Мартос А.* Назв. твор. – С. 248.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

69. *Киприанович Г.Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 155.
70. Тамсама. – С. 156–157.
71. Тамсама. – С. 159, 230.
72. Гл.: Первая всеобщая перепись населения Российской империи. 1897 / под ред. Н.А. Тройницкого. – СПб.: Изд. Центр. стат. ком. МВД, 1899–1903. Т. V: Витебская губерния. Тетрадь III. С. XI.; *Грыгор'ева В., Філатава А.* Назв. твор. – С. 54.
73. *Грыгор'ева В., Філатава А.* Назв. твор. – С. 54.
74. История евангельских христиан-баптистов в СССР. – М., 1989. – С. 381.
75. Тамсама. – С. 382.
76. Тамсама. – С. 89.
77. Тамсама. – С. 97.
78. Тамсама. – С. 94; Первая всеобщая перепись населения Российской империи. 1897 / под ред. Н.А. Тройницкого. – СПб.: Изд. Центр. стат. ком. МВД, 1899–1903. Т. V: Витебская губерния. Тетрадь III. – С. 88–89.
79. *Дембовецкий А.* Опыт описания Могилевской губернии. – Могилев на Днепре, 1882. – Книга 1. – С. 653.
80. Тамсама. – С. 663–664.
81. Могилевская епархия. Историко-статистическое описание. Т.1. Выпуск 2, ч.2. – Могилев, 1910. – С. 163.
82. Могилевская старина. Выпуск 3. – Могилев на Днепре, 1903. – С. 31.
83. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1989. – С. 475.
84. *Короткая Т.П., Прокошина Е.С., Чудникова А.А.* Старообрядчество в Белоруссии. – Мн., 1992. – С. 15.
85. *Грыгор'ева В., Філатава А.* З гісторыі канфесіянальнага жыцця Віцебскай губерні (канец XVIII – пачатак XX стст.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 2. – С. 53.
86. *Кобрин В.* Раскол в Русской Православной церкви // Новый мир. – 1960. – № 12. – С. 68.
87. *Дембовецкий А.* Назв. твор. – С. 675–676.
88. Тамсама. – С. 669.
89. *Короткая Т.П., Прокошина Е.С., Чудникова А.А.* Названы твор. – С. 22.
90. Этнаграфія Беларусі. – Мн., 1989. – С. 475.
91. *Гарбацкі А.* Гісторыя стараабраднiцтва Магілёўшчыны ў канцы XVIII– першай палове XIX стст. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. – 1992. – № 1(2). – С. 58.
92. *Кильсиев В.* Сборник правительственных сведений о раскольниках. – Лондон, 1861. – С. 163.
93. Тамсама.
94. Тамсама. – С. 173–177.
95. Тамсама. – С. 217–219.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

96. *Гарбацкі А.А.* Назв. твор. – С. 57.

97. Могилевские епархиальные ведомости. – 1885. – № 6. – С. 133.

98. *Кузменка М.* Магілёўская епархія ад яе заснавання да 1918 года // Магілёўская даўніна. – 1995. – № 3. – С. 87.

99. Могилевская старина. Выпуск 3. – 1903. – С. 27.

100. *Дембовецкий А.* Назв. твор. – С. 677–678.

101. Могилевская старина. Выпуск 3. – 1903. – С. 29.

102. Могилевские епархиальные ведомости. – 1905. – С. 131.

103. Могилевская епархия. Историко-статистическое описание. – С. 168–169.

104. Тамсама. – С. 164.

105. Тамсама. – С. 166.

106. Тамсама. – С. 202.

107. Гл.: тамсама. – С. 200–203.

108. *Бейлькін Х.* Веткаўскія раскольнікі // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 2. – С. 47.

109. *Гарбацкі А.* Назв. твор. – С. 59.

110. *Ільяшэвіч М.* Расійская палітыка на землях былога Беларуска-літоўскага гаспдарства за панаванне Кацярыны II і Паўла I (1772–1801 гг.). – Вільна, 1993. – С. 11.

111. *Киприанович Г.Я.* сторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильна, 1895. – С. 228–229.

112. Гл.: Первая всеобщая перепись населения Российской империи. 1897. Т. XXIII: Могилевская губерния. – С. 266–269; Т. V: Витебская губерния. Тетрадь III. – С. XI.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# З М Е С Т

У В О Д З І Н Ы ........................................ 3

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА ........................................ 4

ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАНФЕСІІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ
У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ ........................................ 5

ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА ........................................ 6
УНІЯЦТВА ........................................ 19
КАТАЛІЦКАЯ ЦАРКВА ........................................ 26
ПРАТЭСТАНТЫЗМ ........................................ 33
СТАРААБРАДНІЦТВА ........................................ 37

СПАСЫЛКІ ........................................ 47

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

**Апіок** Тамара Уладзіміраўна

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАНФЕСІІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Вучэбна-метадычныя матэрыялы для студэнтаў
IV курса гістарычнага факультэта
(спецыяльнасць "Гісторыя айчынная і ўсеагульная")


Тэхнічны рэдактар *Г.М. Гладун*
Камп'ютэрная вёрстка *С.А. Кірыльчык*
Карэктар *Г.В. Цецерукова*

Падпісана ў друк 5. 05 .2010.
Фармат 60x84/16. Гарнітура Times New Roman Cyr.
Ум.-друк. арк. 3,0. Ул.-выд. арк. 3,3. Тыраж 60 экз. Заказ № 187.

Установа адукацыі "Магілеўскі дзяржаўны універсітэт
імя А.А. Куляшова", 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.
ЛИ № 02330/278 ад 30.04.04 г.

Надрукавана ў аддзеле аператыўнай паліграфіі
УА "МДУ імя. А.А. Куляшова". 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова